КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 41 (264) ◂ 4 лістапада ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ**

Стар. 4

**ЖАНЧЫНА-ПРЭЗІДЭНТ — БЯДА ЦІ ШАНЕЦ?**

У найноўшай гісторыі незалежнай Беларусі быў толькі адзін выпадак, калі жанчына паспрабавала замахнуцца на прэзідэнцкую пасаду

Стар. 6

**ПРЫНЦЭСА Ў МЯСАРУБЦЫ**

Кейт Мідлтан — маладая жонка прынца Уільяма — імкліва ідзе шляхам ягонай маці прынцэсы Дыяны

Стар. 11

**БЕЛАРУСКІ ГОРАД КАЗІМІР**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ЗАБОЙСТВА ВІЛЬГЕЛЬМА КУБЭ**

Гісторыка-дакументальнае эсэ Анатоля Валахановіча

▸ **З НАГОДЫ**

# ХІТРАСЦЬ СУПРАЦЬ СТРАТЭГІІ

**Канстанцін СКУРАТОВІЧ**




**Паказчыкі знешняга гандлю зараз з'яўляюцца найважнейшымі для ацэнкі эканамічнай палітыкі ўладаў. Бо для паляпшэння гэтых паказчыкаў (прынамсі, так сцвярджаецца публічна) была праведзена двайная дэвальвацыя беларускага рубля.**

Яшчэ напрыканцы лета А. Лукашэнка, спрабуючы хоць крышку зменшыць пратэстныя настроі абрабаванага насельніцтва, ацаніў рух да гэтай мэты станоўча: «Ёсць устойлівая тэндэнцыя па выхаду на дадатнае сальда знешняга гандлю. За апошні месяц мы атрымалі дадатнае сальда ў памеры амаль 200 мільёнаў долараў»! Па яго ж словах выходзіла, што валюта хлынула ў Беларусь у гістарычна нечуваных памерах.

На першы погляд, так яно і ёсць. Па дадзеных гандлёвага балансу, памеры беларускага экспарту тавараў за 8 месяцаў бягучага года дасягнулі 26 мільярдаў долараў, і ўзраслі адносна студзеня-жніўня 2010 года ў бягучых коштах на 68,7%, або на 10,6 мільярда долараў.

Выходзіць, па тэмпах росту экспарт абагнаў тэмпы абясцэньвання рубля ў выніку «першай» дэвальвацыі. Выходзіць, спраўдзілася мара ідыёта? Але чаму Лукашэнка назваў не гэтыя амаль 11 мільярдаў прыросту, якія б забяспечылі бязбеднае існаванне эканоміцы, а жалю вартыя 200 мільёнаў? Усяго па 20 долараў на аднаго жыхара, з якога стрэслі тысячы.

Адказ просты — яго кожны ведае: каб карова толькі давала малако, а есці не хацела, то яно б добра было.

Зразумела, што беларуская эканоміка — не боская карова. Хутчэй яна падобна да каровы, якая есць столькі, колькі належыць карове, а малака дае як каза. Прынамсі, адначасова з экспартам павысіўся і імпарт, які склаў 30 мільярдаў долараў. Праўда, імпарт павысіўся толькі на 9,6 мільярда (на 46,8%) і крыху адстаў па тэмпах павялічэння ад экспарту. Але сальда зноў склалася адмоўнае ў памеры 4 мільярда долараў. А за 8 месяцаў мінулага года было амаль 5 мільярдаў. Быццам бы сапраўды крок наперад, але ж, як кажуць у такіх выпадках, тапельцу не важна, колькі вады ў яго над галавой.

Па ўжо традыцыйнай схеме «падводнага плавання», Беларусь мае мінус 4,9 мільярда долараў у гандлі з краінамі СНД, мінус 6,1 мільярда — з краінамі Мытнага саюзу, у тым ліку з Расіяй — мінус 6,4 мільярда, з Казахстанам — плюс 325 мільёнаў, за краінамі ЕС (27) — плюс 4,4 мільярда, з астатнімі краінамі свету — плюс 972 мільёна долараў.

Вось такая эканамічная геаграфія і геапалітычнае становішча. Калі адкінуць звыклыя дробязі, у якія нас пастаянна тыцкаюць вядомыя дзеячы, эканоміка з пункту гледжання сваіх экспартных магчымасцяў ды імпартных патрэб застаецца велічынёй нязменнай. Скарацілі коштам падвышэння мытаў і дэвальвацыі імпарт — адмоўнае сальда крыху паменшылася. Але, як і раней, усё ў народнай гаспадарцы круціцца вакол перапрацоўкі імпартнай нафты і продажу нафтапрадуктаў. Першая «састаўная частка» адбудавана стасункамі з Расіяй, другая — стасункамі з краінамі Еўрасаюза. Беларусь мае да іх сапраўдны і палкі інтарэс. Яны таксама цікавяцца Беларуссю, а вось праблемамі яе эканомікі, падаецца, ніхто не цікавіцца.

У першую чаргу сама Беларусь.

Што тычыцца краін СНД, уключна з Расіяй і Казахстанам, то на гэтай практычна адзінай некалі эканамічнай прасторы былога СССР статус і месца Беларусі прынцыпова змяніліся пад уздзеяннем эканамічных адносін новага тыпу — рынкавых. Раней мэтай вытворчасці было падвышэнне валавога прадукту. Хто больш рэсурсаў траціў (нават псаваў) на вытворчасць прадукцыі, таму болей і плацілі. А паколькі Беларусь (тады БССР) спецыялізавалася на апрацоўцы, перапрацоўцы сыравіны і зборцы вузлоў і камплектуючых, то памеры яе валавой прадукцыі вызначаліся іх коштам, да якіх дадаваўся кошт выпрацаванай валавой вартасці. І атрымоўвалася, валавая вытворчасць вельмі вялікая, а эфектыўнасць — вельмі высокая.

У тыя часы нават марнатраўства разглядалася як асаблівы від эфектыўнай сацыялістычнай працы. У планавым парадку. Прыкладам, можна пярсцёнак зрабіць з латуні, можна з золата. Па працаёмістасці паміж імі, мусіць, няма вялікай розніцы. Але ж якая велізарная розніца ў коштце! З гэтай нагоды ўсе стараліся выкарыстоўваць «золата» нават там, дзе было дастаткова звычайнай бляхі. Зробіш больш дарагую рэч — больш заплацяць, ды яшчэ і ордэн дадуць.

Кіраўнікі сённяшняй Беларусі, большасць якіх сфарміравалася ў часы гарантаванага безгаспадарчага сацыялізму, да гэтай часу напружваюць эканоміку на вытворчасць вала. Радуюцца і ўсіх змушаюць радавацца, калі ён расце. Але ж зараз гэты вал вырабляецца не па заданнях Дзяржплана, і таму не падлягае гарантаванай (безальтэрнатыўнай) рэалізацыі. Яго трэба прадаваць ва ўмовах канкурэнцыі. На сусветных рынках — вельмі жорсткай, на «адзінай эканамічнай прасторы» — з інтэграцыйнымі зніжкамі.

Першы шлях вельмі цяжкі, другі палохае відавочнай лёгкасцю. Той самы выпадак, калі кажуць, што бясплатны сыр бывае толькі ў пастцы. Для першага шляху патрабуецца стратэгія, для другога — хітрыкі, памножаныя на безумоўныя рэфлексы — палітычнага выжывання, харчавання, памнажэння.

Існуе вельмі вялікая верагоднасць самога сябе перахітрыць. Ды яно ўжо так і было неаднойчы. Прыкладам, з гэтымі дэвальвацыямі.

Уласна кажучы, пытанне выхаду на дадатнае знешнегандлёвае сальда «ўпіраецца» ў Расію і можа быць вырашана толькі тады, калі «інтэграцыйныя зніжкі» ўстановяць на газ і нафту «вельмі смешныя кошты». Але нават гэтага будзе недастаткова, каб пасур'ёзнаму замацавацца на рынках тых 190 краін, з якімі Беларусь сёння мае знешнегандлёвыя кантакты.

Ваенная хітрасць — рэч патрэбная, але яна не здольная замяніць стратэгію.

Як яно пачалося з першага дня незалежнасці, так да гэтага часу і цягнецца. Як сведчыць Белстат, асноўнымі крыніцамі фармавання адмоўнага сальда з'яўляюцца экспартна-імпартныя аперацыі з прамежкавымі таварамі (энерганосьбіты, сыравіна, матэрыялы, камплектуючыя). Прыкладам, год таму яго велічыня складала 5,3 мільярда, а сёлета — 4,2 мільярда долараў. Быццам бы і прагрэс. Але гэта «зэканомлены» мільярд у асноўным дасягнуты коштам падвышэння на 700 мільёнаў пастаў на знешнія рынкі калійных угнаенняў, а не падвышэння эфектыўнасці прамысловасці.

Соль — гэта таксама неаднаўляльны прыродны рэсурс. Можа скончыцца раней, чым Беларусь дачакаецца выгод ад абяцанай адзінай эканамічнай прасторы.

ГАСЦІННАСЦЬ

# АДМОВІЛІ Ў ВІЗЕ



Генадзь КЕСНЕР

**Беларускае пасольства ў Францыі адмовіла ва ўязной візе прэзідэнту Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека (FIDH) Сухайр Белхасэн.**

Прэзідэнт мелася прысутнічаць на судовым працэсе над Алесем Бяляцкім. Дарэчы, Алесь Бяляцкі з'яўляецца віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека.

Апроч Сухайр Белхасэн, ва ўездзе ў Беларусь адмоўлена таксама яшчэ і двум юрыстам з Нарвегіі, прадстаўнікам Фонду Дамоў правоў чалавека Ане Бондэ і Дайвэ Петкевічутэ.

«Улады баяцца менавіта таго, што сапраўдныя абставіны і факты незаконнага прыцягнення да крымінальнай адказнасці аднаго з самых вядомых не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі праваабаронцы зробяцца яўнымі, станучца набыткам шырокай галоснасці, у тым ліку і для міжнароднай грамадскасці. Яны хацелі б ціха разглядзець гэтую справу, а потым прыкрыцца выракам «незалежнага і справядлівага» суда і затым крычаць на ўвесь свет, што яны ў судовую дзейнасць не ўмешваюцца, што суд аб'ектыўна, грунтоўна разабраўся ў сутнасці абвінавачання, даследаваў доказы, прызнаў Бяляцкага вінаватым, а цяпер рабіце, што хочаце», — адзначае кіраўнік юрыдычнай камісіі БХК Гары Паганяйла.

СУД

# КАРЭТНІКАВУ ДАЛІ ДЗЕСЯЦЬ СУТАК

**Адзін з лідараў «Правага Альянсу» Юрась Карэтнікаў быў асуджаны суддзёй Савецкага раёна Мінску Дзмітрыем Паўлючэнкам на 10 сутак адміністрацыйнага арышту за «дробнае хуліганства».**

Карэтнікаў нібыта спраўляў натуральныя патрэбы, за што і быў затрыманы.

Сябра Рады і паплечнік Юрыя Карэтнікава Аляксандр Шпакоўскі пракаментаваў наступным чынам сітуацыю, якая склалася вакол затрымання Карэтнікава: «Гэта банальная помста за актыўную грамадзянскую пазіцыю і ўдзел у падзеях 19 снежня. Такая методыка таксама сведчыць пра вузкасць мыслення кіраўніцтва беларускіх спецыяльных службаў. Чалавек вярнуўся на Радзіму, не спалохаўся і не гадзіў з-за мяжы. Так, ён не згодны з пэўнымі тэзісамі дзеючай улады, але гэта не значыць, што ў дачыненні да яго трэба тварыць беззаконне. Такія выхадкі ўладаў толькі азлабляюць людзей у перыяд крызісу. У цяперашняй сітуацыі трэба думаць пра тое, як выратаваць і захаваць суверэнную дзяржаву, а не дзяліць людзей на правільных і няправільных па ідэалагічных перакананнях. Мы прымем усе неабходныя меры ў рамках прававога поля, каб ён выйшаў на волю, а вінаватыя ў фальсіфікацыі складу правапарушэння панеслі адказнасць».

Нагадаем, што Юрась Карэтнікаў быў затрыманы разам са сваім сябрам Сяргеем Савіным пасля сканчэння традыцыйнага шэсця ў Курапаты, Юрась і Сяргей зайшлі ў краму «Паўночны», на выхадзе з якой і былі затрыманы супрацоўнікамі праваахоўных органаў.

Паводле інфармацыі «Правага Альянсу»

ПАРАДЫ

# БЮДЖЭТ ТРЭБА АШЧАДЖАЦЬ

Вольга ХВОІН

**Эксперты Сусветнага банка падрыхтавалі рэкамендацыі па скарачэнню дзяржаўных выдаткаў у Беларусі.**

Даклад «Агляд дзяржаўных выдаткаў у Рэспубліцы Беларусь: Рэфармаванне бюджэтна-падатковай сферы ў мэтах аднаўлення ўстойлівага эканамічнага росту» з'яўляецца першай часткай двухэтапнага Агляду дзяржаўных выдаткаў. Эксперты прапануюць ураду Беларусі правесці фіскальныя рэформы па прыярытэтных напрамках бюджэтнай палітыкі. Рэкамендацыі скіраваныя на скарачэнне маштабу дзяржаўнага кіравання эканомікай і павышэнне эфектыўнасці дзяржаўнага сектара ў Беларусі пры адначасовым прыняцці адпаведных мер па змякчэнню наступстваў рэформаў для найбольш неабароненых катэгорый насельніцтва.

У дакладзе прадстаўлены рэкамендацыі па асобных напрамках бюджэту, а менавіта ў сферы пенсійнага забеспячэння, сацыяльнай абароны, энергетычных паслуг, у галіне сельскай гаспадаркі, а таксама прапанаваныя варыянты рэформаў, якія могуць забяспечыць штогадовую эканомію бюджэтных сродкаў у аб'ёме да 4 працэнтаў ВУП у сярэднетэрміновы перыяд.

У прыватнасці, звяртаецца ўвага на тое, што трэба ўзмацніць кантроль за бюджэтнымі ўліваннямі ў сельскую гаспадарку. Праграма рэфармавання сельскай гаспадаркі патрабуе рэалізацыі сукупнасці ўзаемазвязаных фіскальных і структурных рэформаў, у тым ліку скарачэнне дзяржаўнай падтрымкі і субсідзіравання сельскагаспадарчай галіны.

Таксама эксперты заклікаюць падвысіць адрасную накіраванасці выдаткаў на сацыяльную дапамогу: «У праграмах сацыяльнай дапамогі пераважаюць катэгарыяльныя трансферты, тады як на долю праграм, заснаваных на ацэнцы патрэбнасці, прыходзіцца невялікая частка выдаткаў. У выніку, значную частку дапамогі атрымліваюць хатнія гаспадаркі, якія не з'яўляюцца малазабяспечанымі. У сістэме сацыяльнай дапамогі неабходна пераразмеркаванне сродкаў на адрасныя праграмы».

АДУКАЦЫЯ

# СЛАНА І НЕ ЗАЎВАЖЫЎ

**Намеснік міністра адукацыі Беларусі Казімір Фарыно ўпэўнены, што ў краіне няма праблем з беларускай мовай.**

У Гомелі праходзіў заключны этап алімпіяды беларускіх і расійскіх школьнікаў «Расія і Беларусь: гістарычная і духоўная супольнасць», дзе і прысутнічаў намеснік міністра адукацыі. Калі ж журналісты пачалі задаваць вострыя пытанні наконт сітуацыі з беларускай мовай, Казімір Фарыно заявіў: «Сёння такія вось правакацыйныя пытанні не маюць пад сабой падстаў, у нас роўная колькасць гадзін на вывучэнне як беларускай, так і рускай моваў».

«Сёння праблемы білінгвізму цяжкія і больш напружаныя для нас, чым для расіян, у нас дзве мовы па Канстытуцыі, абавязковыя для вывучэння. Проста іншы раз асобныя факты падаюцца гіпертрафавана. Не трэба хваляваца, ці знікне беларуская мова і літаратура, таму што дзяржава падтрымлівала і падтрымлівае ўсё наша нацыянальнае, айчыннае, усё, што створана тут самае лепшае», — цытуе словы Фарыно агенцтва БелаПАН.

Каб праілюстраваць роўнасць дзяржаўных моў, прывядзём некалькі лічбаў. Летась 19% беларускіх школьнікаў навучалася на беларускай мове. У сталіцы такіх вучняў было толькі за 2%. За апошнія дзесяць гадоў колькасць вучняў, якія атрымліваюць сярэднюю адукацыю на беларускай мове, істотна скарацілася: у 2001–2002 годзе ў Беларусі такіх вучняў было 27,8%.

Афіцыйна ў 2009–2010, 2008–2009 навучальных гадах прыблізна 57% агульнаадукацыйных устаноў краіны працавалі на беларускай мове. У 2010–2011 годзе іх колькасць склала 52,1% ад агульнай колькасці. Але беларускамоўныя школы — гэта ў асноўным вясковыя, і лік вучняў там, адпаведна, непараўнальна меншы, чым у гарадскіх класах з рускай мовай навучання.

Дарэчы, той жа Фарыно напрыканцы жніўня паведамляў, што сёлета ў краіне зачыняецца 65 школ, большасць з іх — беларускамоўныя.

ПАМАЦЬ

# ДЫПЛАМАТЫ ЕЎРАСАЮЗА НАВЕДАЛІ КУРАПАТЫ

**3 лістапада кіраўнікі дыпмісій краін ЕС у Мінску наведалі ўрочышча Курапаты, месца масавага забойства і пахавання ахвяр сталінскага тэрору.**

Для дыпламатаў ЕС ужо стала традыцыяй наведваць урочышча з нагоды Дзядоў, Дня памінання продкаў, каб аддаць даніну павагі памяці ахвяраў таталітарнага рэжыму.

Дыпламаты ўсклалі кветкі на пагорку каля каменю, якім пазначана месца, абранае ўрадам Беларусі для ўзвядзення мемарыяла, які ўвекавечыў бы памяць пра трагічныя лёсы людзей, забітых і пахаваных тут.

Паводле інфармацыі Delegation of the European Union to Belarus

КАНФЕРЭНЦЫЯ

# ВЯРНУЦЬ МОВУ Ў ЦАРКВУ

Сяргей ЧЫГРЫН

**Упершыню ў Мінскай Духоўнай Акадэміі і Семінарыі ў Жыровічах прайшла навуковая канферэнцыя, прысвечаная праваслаўю і беларускай літаратуры. Канферэнцыя пачалася з малебна ўсім беларускім святым.**



У канферэнцыі прынялі ўдзел дактары і кандыдаты навук, гісторыкі і пісьменнікі, краязнаўцы і настаўнікі з Жыровічаў, Слоніма, Гродна, Брэста, Мінска і іншых гарадоў Беларусі.

Даклады і спрэчкі выступоўцаў былі даволі гарачымі і разнастайнымі. Доктар філалагічных навук Іван Чарота з Мінска распавёў пра дэсакралізацыю і літаратуру, доктар філалагічных навук з Брэста Зоя Мельнікава расказала ўдзельнікам канферэнцыі пра нацыянальную і духоўна-хрысціянскую ідэі ў беларускай літаратуры XX стагоддзя. Прафесар таксама звярнулася з просьбай да праваслаўных святароў — вярнуць беларускую мову ў царкву.

Пра мову і царкву, хрысціянскі кірунак у беларускай паэзіі, пра пераклады Святога Пісання на беларускую мову распавядалі ў сваіх выступленнях кандыдат багаслоўя іераманах Еўстафій Халіманкоў, прафесар, кандыдат багаслоўя Сергій Гардун.

Многія даследчыкі распавядалі пра сувязь канкрэтных беларускіх пісьменнікаў з праваслаўем. Тыя, хто прымаў удзел у канферэнцыі, даведаліся пра хрысціянскія каштоўнасці ў «Палескай хроніцы» Івана Мележа, пра хрысціянскія матывы ў творчасці Алеся Гаруна і Уладзіміра Караткевіча, пра мовазнаўчы погляд на «Малітву» Наталлі Арсенневай як рэлігійна-патрыятычны гімн, пра Максіма Гарэцкага і пытанні веравызнання ў Беларусі, пра духоўнае выхаванне на ўроках беларускай літаратуры і г.д.

Канферэнцыю арганізаваў брат Мікалай (Зьніч) з Жыровіцкага манастыра. Усе выступленні праз пэўны час будуць выдадзены асобнай кнігай, якой, дарэчы, па тэме «Праваслаўе і беларуская літаратура» няма ў Беларусі.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ХТО Б МОГ ПАДУМАЦЬ!

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Нарэшце, даспелі. Аляксандр Лукашэнка, выступаючы 29 кастрычніка перад выкладчыкамі Таджыкскага тэхнічнага ўніверсітэта імя акадэміка М.С. Асімі, заявіў, што настаў час «расчысціць дарогу для поўнафарматнага ўзаемадзеяння» з Захадам.**




Канешне, не без агаворак. «Двайныя стандарты, якія прымяняюць еўрапейцы, спробы націску і ўжыванне санкцый не стануць канструктыўным элементам палітыкі», — заявіў ён.

«Упэўнены, даўно надышоў час адмовіцца ад гэтых штучных бар'ераў, замшэлых стэрэатыпаў і расчысціць шлях для поўнафарматнага ўзаемадзеяння, які адпавядае чаканням нашых народаў», — цытуе беларускага афіцыйнага лідара дзяржаўнае інфармагенцтва БелТА.

Лукашэнка нагадаў, што Еўрасаюз для Беларусі з'яўляецца найважнейшым гандлёвым партнёрам і буйным інвестарам. Тавараабарот з краінамі Еўрасаюза, паводле яго слоў, на 5% перавышае тавараабарот з Расіяй, галоўным палітычным і эканамічным партнёрам Беларусі. «Але вы ведаеце, як паводзіць сябе Еўрасаюз: нейкая дэмакратызацыя (чытай — хаос і развал). Але ні вам, ні нам такая дэмакратызацыя не патрэбная. Мы павінны працаваць у сваіх інтарэсах, інтарэсах свайго народа», — сказаў ён.

Кіраўнік краіны заявіў, што Беларусь забяспечвае беспераборйны транзіт тавараў і энергарэсурсаў у ЕС, ахову межаў, спыняе нелегальную міграцыю. «Так што цікавацца да дыялогу і выбудоўвання нармальных адносін павінна аб'ектыўна прысутнічаць у абодвух бакоў. Пры гэтым мы не стаім з працягнутай рукой, выпрошваючы супрацоўніцтва, — мы яго прапануем», — заявіў ён.

Гэта датычыцца і адносін з ЗША, адзначыў ён. «Не мы былі ініцыятарамі цяперашніх складанасцяў у нашым дыялогу. Наадварот, Беларусь заўсёды была адказным партнёрам Злучаных Штатаў у барацьбе з тэрарызмам, наркатрафікам, адмываннем грошай і гандлем людзьмі», — сказаў Лукашэнка. Паводле яго слоў, Беларусь таксама аказвае спрыянне Вашынгтону ў вырашэнні афганскай праблемы.

Нарэшце Еўропы — усё зразумела. Сапраўды, Беларусь спыняе нелегальную міграцыю, наркатрафік, гандаль людзьмі. Пра «бесперабойны транзіт тавараў і энергарэсурсаў» можна было б прамаўчаць. Усё ж такі бесперабойны транзіт энергарэсурсаў мы не забяспечвалі, і «зачынялі газавы кранік» у час нафтагазавых войнаў з Расіяй неаднаразова. І Еўропа не заставалася ўбаку. Дастаткова толькі ўзгадаць, колькі грошай на лініі Еўропы было патрачана на абсталяванне беларускай мяжы.

А вось ЗША — ну гэта вельмі дзіўна. З Еўропай разабраліся — ад Партугаліі да Беларусі прыкладна (лінейкай памераць на мапе можна!) да Уральскіх гор, якія аддзяляюць Еўропу ад Азіі (геаграфічна) — прыкладна аднолькавая адлегласць. Але тое, што Беларусь «таксама аказвае спрыянне Вашынгтону ў вырашэнні афганскай праблемы»… Выбачайце. Дзе Вашынгтон, дзе Мінск, і дзе Кабул? Як мы можам аказваць гэтую падтрымку і спрыянне? Тым больш, што Лукашэнка сам неаднаразова заяўляў — нашы вайскоўцы за межамі Беларусі ваяваць не будуць.

Гэта, дарэчы, ён у чарговы раз падкрэсліў 31 кастрычніка на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод. «У краіне не дапусцілі разгулу злачыннасці і хаосу. Беларусь застаецца мірнай і згуртаванай краінай», — заявіў Лукашэнка.

То бок, мы мірныя людзі. Але ўдзельнічаем у вырашэнні ўзброенага канфлікту ў Афганістане?

Дарэчы, шмат якія аглядальнікі заўважылі, што Лукашэнка ўзнагародзіў следчых, якія хутка выкрылі «тэрарыстаў». Лукашэнка ўручыў узнагароды вайскоўцам і супрацоўнікам праваахоўных органаў. «Мы ўзнагароджваем людзей, якія мелі непасрэднае дачыненне да раскрыцця тэракта ў мінскім метро. І тых, хто ахоўвае парадак нашай радзімы кожны дзень», — сказаў ён.

Між тым, прысуд па справе аб тэрактах у мінскім метро 11 красавіка 2011 года яшчэ не вынесены. І так званыя «тэрарысты» — Зміцер Канавалаў і Уладзіслаў Кавалеў, вінаватымі дагэтуль не з'яўляюцца. Іх віну можа вызначыць толькі суд. А ўзнагароджваць за «раскрыццё злачынства» яшчэ да вынясення прысуду… А раптам суд прызнае іх невінаватымі?

Па меркаванні юрыстаў, такім чынам Лукашэнка наўпрост умешваецца ў ходу следства. «Скажыце, які суддзя, хай нават ён і цэлы намеснік старшыні Вярхоўнага суда, рызыкне не тое каб спрачацца, а проста кінуць цень на аўтарытэт Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі? Правільна. Ніякі. Такіх суддзяў у РБ не водзіцца», — пракаментаваў рашэнне Лукашэнкі аб узнагародзе журналіст Андрэй Пачобут, які таксама неадноўчы сутыкаўся з беларускай судовай сістэмай. Ён ведае, пра што кажа.

Але ж не ўсё ў нас такое… праблемнае. 1 лістапада ў чацвёртым туры групавога этапу Лігі чэмпіёнаў УЕФА барысаўскі БАТЭ згуляў унічыю 1:1 з італьянскім «Міланам». Сустрэча прайшла 1 лістапада на мінскім стадыёне «Дынама» пры аншлагу.

Збянтэжылі нашы вядомы еўрапейскі клуб. «Мілан» шмат забівае, але не гэтым разам, заявіў галоўны трэнер «Мілана» Масіміліяна Алегры на прэс-канферэнцыі ў Мінску пасля матча з БАТЭ.

«Мы павінны былі вырашыць зыход матча ў першым тайме, у нас былі ўсе шансы перамагчы, але, на жаль, гэтага не адбылося. У другім тайме мы атрымалі гол з пенальці, і пасля гэтага наша жыццё ўскладнілася. Калі лік 1:1, перамагчы значна складаней», — сказаў Алегры.

Ён назваў БАТЭ вельмі арганізаванай камандай з вялікай колькасцю таленавітых гульцоў.

А трэнер БАТЭ Віктар Ганчарэнка, здаецца, не хавае радасці. У матчы чацвёртага тура групавога этапу Лігі чэмпіёнаў УЕФА з «Міланам» БАТЭ гуляў дзёрзка, агрэсіўна, не думаючы пра тое, яму супрацьстаіць топ-клуб — казаў Ганчарэнка. «Першы гол у вароты топ-клуба... Гэты выпакутаваны, гульцы ўсё пакінулі сёння на полі», — сказаў Ганчарэнка.

23 лістапада БАТЭ пpыме «Вікторыю», а «Мілан» — «Барселону». Апошнія дзве каманды датэрмінова выйшлі ў 1/8 фіналу ЛЧ, а першыя дзве будуць аспрэчваць трэцяе месца, якое дае права выступіць у 1/16 фіналу Лігі Еўропы. Перамога над чэхамі дазволіць БАТЭ стаць недасягальным.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АНАТОЛЬ ЛЯБЕДЗЬКА



Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька на сваёй старонцы ў Facebook агучыў уласнае меркаванне, што палітуцекачам гэтага года варта вярнуцца ў Беларусь.

«Час выязджаць з Беларусі і час вяртацца. Пасля 19 снежня дзясяткі актывістаў аселі ў замежжы. Рызыкну заявіць, што ці ледзь не ўсім (выключэнні, вядома, ёсць) прыйшоў час купіць квіток да Мінска. Самы час, як паказвае прыклад Юры Карэтнікава. Улада, вядома, нагадзіць тым, хто вернецца. Але па дробнаму. На большае, як, напрыклад, крымінальны перaслед, кішка тонкая. Так што, калі вы ў стане вытрымаць псіхалагічны прэс КДБ, 10–15 сутак за «выпраўленне патрэбы ў непрадугледжаным месцы», то можна дапамагчы Радзіме на радзіме», — заклікае лідар АГП.

Пасля падзей 19 снежня 2010 года за мяжу выехалі дзясяткі грамадскіх актывістаў, сярод іх экс-кандыдат у прэзідэнты Алесь Міхалевіч, кіраўнікі «Свабоднага тэатра» Мікалай Халезін і Наталля Каляда, сацыёлаг прафесар Андрэй Вардамацкі, рэдактарка «Хартыі'97» Наталля Радзіна, прадстаўнікі выбарчых штабоў кандыдатаў у прэзідэнты.

### АЛЕГ КАЧАН



Нацыянальную зборную Беларусі па футболе мусіць трэніраваць «той чалавек, які зможа вывесці на вынікі, што чакаюць краіна, прэзідэнт, урад», — заявіў БелаПАН міністр спорту і турызму Алег Качан.

«Пазіцыя Міністэрства спорту з пазіцыяй федэрацыі футбола супадае ў плане таго, хто павінен трэніраваць зборную», — адзначыў ён. Качан падкрэсліў, што кантракт цяперашняга галоўнага трэнера Бернда Штангe яшчэ не скончыўся. У той жа час міністр заявіў: «Калі трэнер ставіць перад сабой задачу вывесці нашу нацыянальную зборную ў фінальную частку чэмпіянату Еўропы або свету, то яе неабходна выконваць, як і ўсюды ў нас у спорце. Калі чалавек не выконвае, напэўна, павінен саступіць месца іншаму, больш удачліваму, больш прафесійнаму».

Кіраўнік міністэрства адзначыў няроўную гульню зборнай у ходзе адборачнага турніру чэмпіянату Еўропы–2012: «Калі перамагаем Францыю, а потым у Люксембурга не можам выйграць — гэта няправільна. Значыць, недзе ў псіхалогіі не спрацавалі, не настроілі хлопчыкаў і дзяўчынак... У любым выпадку, гэта пралікі трэнераў».

Паводле слоў Качана, шлях у зборную не закрыты ні айчынным, ні замежным спецыялістам. «У нас шмат ёсць прыкладаў у спорце, што і айчынны спецыяліст паказвае вельмі высокі вынік, і многія замежныя спецыялісты прыязджаюць і вучацца ў нашых спецыялістаў, як трэба рыхтаваць таго ці іншага спартоўца або групу спартсменаў. Але ў асобных відах спорту, можа, недастаткова прафесійна працавалі, і кадры проста не гатовыя. Таму звяртаемся да паслуг замежнага спецыяліста, каб дасягнуць максімальнага выніку. Усё залежыць ад задачы, якую мы з вамі ставім перад сабой. Калі проста ўдзел у Алімпійскіх гульнях, чэмпіянаце Еўропы або свету — гэта адно. А калі ў нас мэта ўвайсці ў лік лідараў, у пяцёрку, у тройку, заняць вышэйшую прыступку п'едэстала — патрабуюцца іншыя спецыялісты і іншыя падыходы», — заявіў кіраўнік Мінспорту.

### АНЖАЛІКА КРАШЭЎСКАЯ



Арганізатары Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад», які пройдзе з 5 па 12 лістапада, пастараліся падабраць «усё самае лепшае, што можа быць у кінамастацтве», — заявіла дырэктар фестывалю Анжаліка Крашэўская.

Паводле яе слоў, «у гэтым годзе фестываль пройдзе пад дэвізам «З шырока расплюшчанымі вачыма». «Гэта не проста дэвіз — для гледача мы адкрываем новы кінафармат», — адзначыла Крашэўская.

У рамках фестывалю пройдуць паказы разнажанравага гульнявога і дакументальнага кіно як ад маладых, так і ад знакамітых майстроў кінамастацтва з усяго свету. Шырокую частка праграмы складаюць паказы дзіцячых фільмаў у конкурсе «Лістападзік», а таксама розныя мерапрыемствы і сустрэчы.

Гледачам таксама будзе прапанавана абмеркаваць прэм'еры са шматлікімі рэжысёрамі, якія прыедуць у Мінск прадставіць свае працы.

Гаворачы аб фінансавых выдатках на арганізацыю «Лістапада», Крашэўская адзначыла, што «ўсё адносна». «Напрыклад, Віленскі кінафестываль, які па маштабах меншы, чым наш, мае бюджэт 500 тысяч долараў. У нас значна менш, мы пакуль яшчэ адстаём і толькі спрабуем да гэтага падысці. Каб зрабіць прафесійную, якасную праграму, патрэбныя сродкі, якіх ніколі не бывае дастаткова», — цытуе дырэктара фестывалю БелаПАН.

11 КРАСАВІКА

# ВЫСНОВЫ НЕАДНАЗНАЧНЫЯ

Вольга ХВОІН

**Абвінавачаным у тэрарызме Дзмітрыю Канавалаву і Уладзіславу Кавалёву выстаўленыя іскі больш чым на 4,67 мільярда рублёў.**



Самы вялікі іск у памеры 3 012 600 тысяч рублёў выставіў Мінскі метрапалітэн. Агулам у дачыненні да абвінавачваемых заяўлена 23 іскі. Апроч метрапалітэну страты хочуць спагнаць медустановы.

Галоўны абвінавачваны Дзмітрый Канавалаў абвясціў, што прызнае грамадзянскія іскі толькі па эпізодах, звязаных з выбухамі ў Мінску 4 ліпеня 2008 года і 11 красавіка 2011 года. Адпаведна, ён не прызнаў іскі, вылучаныя супраць яго медыцынскімі ўстановамі Віцебска, звязаныя з выбухамі ў гэтым горадзе 14 і 22 верасня 2005 года.

Абвінавачаны ў саўдзеле Уладзіслаў Кавалёў заявіў суду, што не мае дачынення да падрыхтоўкі і ажыццяўлення выбуху ў метро, таму грамадзянскія іскі супраць яго не прызнае.

Што тычыцца доказнай базы віны Канавалава і Кавалёва ў выбухах па краіне ад пачатку 2000-х гадоў, то пытанняў з кожным судовым пасяджэннем па справе выбуху менш не становіцца. Так, расійскія эксперты, якія даследавалі некаторыя кампаненты выбухной прылады, што была знойдзеная ноччу 3 ліпеня 2008 года ў раёне скрыжавання праспектаў Машэрава і Пераможцаў у Мінску, у ходзе следства вызначылі магчымы рэгіён яго вырабу.

Эксперты знайшлі на кампанентах бомбы пылок раслін. На падставе чаго зрабілі выснову, што гэтыя кампаненты бомбы маглі вырабляцца або знаходзіцца ў заходняй частцы Бранскай вобласці, у Калінінградскай вобласці, паўднёва-заходняй частцы Беларусі, паўночна-заходняй частцы Украіны, паўночна-ўсходняй частцы Польшчы, а таксама ў Літве і Латвіі. Вырабляцца яны маглі ў гарадскіх умовах, напрыклад, паблізу батанічнага саду. Як бачым, Віцебск у спіс месцаў вытворчасці бомбы не патрапіў.

Таксама эксперт не змог адназначна сказаць суду, што намаляваныя схемы ўзрыўпакетаў у папяровай і металічнай абалонках, узарваных у Віцебску ў першай палове 2000-х гадоў, якія ёсць у матэрыялах справы Дзмітрыя Канавалава і Уладзіслава Кавалёва, ёсць схемамі самаробных выбуховых прылад. Па словах супрацоўніка Дзяржаўнага экспертна-крыміналістычнага цэнтра МУС Мікалай Казарэза, тэарэтычна гэта могуць быць схемы менавіта выбуховых прылад, але толькі тэарэтычна. Усе самаробныя выбуховыя прылады павінны ацэньвацца толькі пры іх наяўнасці», — некалькі разоў заявіў падчас допыту Казарэз.

Казарэз таксама заявіў, што па тэхніцы бяспекі забаронена плавіць трыперакіс або дыперакіс ацэтону, бо гэта небяспечна. Па версіі следства, Канавалаў праводзіў такія дзеянні з ініцыявальным выбуховым рэчывам.

Іншы эксперт дзяржаўнага экспертна-крыміналістычнага цэнтра МУС Сцяпан Клімовіч мяркуе, што часткі выбуховых прыладаў, якія ўзарваліся, былі выяўленыя 3 ліпеня 2008 года ў Мінску, маглі вырабіць розныя людзі.

У эксперта склалася ўражанне, быццам гэта выпускнік спецыяльнай навучальнай установы рыхтаваў дыпломны праект. Свае высновы эксперт засноўвае на некалькіх момантах. Паводле яго слоў, выяўленае выбуховае прыстасаванне было выраблена старанна, акуратна, што сведчыць аб добрай маторыцы і добрых навыках. Паражальныя элементы былі акуратна складзеныя ў спецыяльна зробленую для іх з ватману скрыначку. А ў выбуховай прыладзе, што ўзарвалася падчас святкавання Дня незалежнасці, для ўпакоўкі паражаючых элементаў выкарыстоўваўся ліст пісчай паперы фармату А4. Эксперт выказаў здагадку, што, магчыма, той, хто вырабляў другую выбухоўку, спяшаўся, хоць і рабіў яе «не на бягу».

Эксперт Клімовіч адзначыў нядбайнае нанясенне прыпою ў самаробнай выбуховай прыладзе (СВП), што не спрацавала. Паводле яго слоў, ён сам так паяў у дзяцінстве, магчыма, пайка ажыццяўлялася халодным паяльнікам. У выбуховай прыладзе, што спрацавала, наадварот, пайка была выканана вельмі акуратна.

Эксперт выказаў здагадку, што прынцып выканаўчага механізму ў абодвух СВП мог быць аднолькавым, але са 100-працэнтнай упэўненасцю пра гэта казаць не стаў.

СУД

# Алесь Бяляцкі: Я НЕ ЛІЧУ СЯБЕ ВІНАВАТЫМ

Генадзь КЕСНЕР

**У будынку суда Маскоўскага раёна Мінска 2 лістапада распачаўся працэс над старшынёй зачыненага ўладамі Праваабарончага цэнтра «Вясна», віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека (FIDH) Алесем Бяляцкім.**




Слыннага праваабаронцу абвінавачваюць ва ўтойванні прыбытку ў асабліва буйным памеры (ч. 2 арт. 243 Крымінальнага кодэкса Беларусі). Грамадзянская супольнасць лічыць справу Бяляцкага палітычна матываванай і звязвае з праваабарончай дзейнасцю падсуднага.

Яшчэ задоўга да пачатку працэсу ў будынку суда сабраліся дзясяткі прадстаўнікоў розных беларускіх і замежных праваабарончых арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў, дэмакратычных партый і рухаў, а таксама журналісты, былыя палітвязні і кіраўнікі дыпламатычных місій краін Еўрапейскага саюза і ЗША. Нягледзячы на даволі вялікую залу, усе жадаючыя ўсё роўна не змаглі патрапіць на судовае пасяджэнне. Варта адзначыць, што тэлеаператарам дазволілі весці здымкі першых дзесяці-пятнаццаці хвілін судовага пасяджэння. Такі «прыступ дэмакратыі» не змаглі ўзгадаць нават ветэраны дэмакратычнага руху. Здымкі былі спынены толькі пасля таго, як на гэтым настаяў пракурор Сайкоўскі.

Старшынюе на працэсе суддзя Ленінскага раёна Мінска Сяргей Бандарэнка (слуханні праходзяць у будынку Маскоўскага райсуда з прычыны адсутнасці ў Ленінскім судзе вялікіх залаў).

Алесь Бяляцкі і яго адвакат Зміцер Лаеўскі (прычым абаронца — двойчы) заяўлялі хадайніцтвы аб змяненні меры стрымання абвінавачанаму, але абодва разы суддзя Бандарэнка пасля сыходу ў дарадчы пакой адмаўляў у задавальненні гэтых хадайніцтваў.

Таксама было адхілена хадайніцтва аб вядзенні судовага працэсу па-беларуску. Узамен Алесю Бяляцкаму была прадстаўлена перакладчыца Кацярына Ермакова, якая, аднак, прадэманстравала не самыя лепшыя здольнасці ў перакладчыцкай справе і такое ж веданне беларускае мовы. Былі адхіленыя ці перасунутыя на больш позні тэрмін яшчэ некалькі хадайніцтваў з боку абароны.



Суддзя паведаміў Алесю Бяляцкаму, што той можа адмовіцца ад дачы паказанняў, але праваабаронца заявіў, што будзе адказваць на пытанні. «Я не лічу сябе вінаватым. Мяне пераследуюць выключна за праваабарончую дзейнасць, а абвінавачванні ва ўтойванні прыбыткаў і нявыплаце падаткаў ёсць толькі падставай для майго арышту», — адзначыў падсудны.

Крыху пазней, падчас допыту пракурорам Сайкоўскім, Алесь Бяляцкі зрабіў заяву, датычную яго замежных рахункаў. «Я з'яўляўся ўладальнікам рахунка, але грошы ішлі на дзейнасць «Вясны» і нашых партнёраў у Беларусі. Я не распараджаўся гэтымі сродкамі, на іх расходаванне складваліся адпаведныя дамовы. Прыклады гэтых дамоваў прадстаўлены ў КДБ. Апроч іх існавалі іншыя дакументы. Я не быў уладальнікам гэтых грошай, а быў перадатачным звяном. Гэтыя сродкі датычыліся працы рэгіянальных грамадскіх прыёмных Праваабарончага цэнтра «Вясна», яны перадаваліся ахвярам палітычных рэпрэсій. Нашым міжнародным партнёрам накіроўваліся справаздачы па расходаванні сродкаў — кветкі, друк, выданне бюлетэняў, дапамога рэпрэсаваным. Апроч таго, не ўсе гэтыя грошы расходаваліся ў Беларусі, частка з іх выкарыстоўвалася за мяжой на друк, на навучанне. Я не бачу сваёй карысці з гэтых сродкаў, я асабіста іх у Беларусь не ўвозіў», — адзначыў праваабаронца.

Адвакат Зміцер Лаеўскі хадайнічаў перад судом, каб той накіраваў запыт да фундатараў «Вясны» наконт таго, як расходаваліся грошы, пералічаныя на рахунак Бяляцкага. Суддзя, аднак, гэты зварот абаронцы пакінуў па-за ўвагай. Допыт Алеся Бяляцкага працягваўся да самага канца першага дня судовых слуханняў.

Нагадаем, што яшчэ пры канцы чэрвеня падатковая інспекцыя прад'явіла Алесю Бяляцкаму акт праверкі са звесткамі пра грашовыя сродкі, якія паступілі на рахунак у літоўскім банку Nordbank. Па словах падаткавікоў, банкаўскія звесткі былі ім прадастаўлены Міністэрствам юстыцыі Літвы. А выпіскі з банкаўскага рахунка Бяляцкага ў Польшчы беларускаму боку прадставіла пракуратура РП. Пазней і польскі, і літоўскі бакі папрасілі за свае дзеянні прабачэнні. Паводле інфармацыі боку абвінавачання, на згаданыя рахункі былі пералічаны 550 тысяч еўра, з сумаў, што паступілі, не былі сплачаны падаткі ў памеры 352 мільёны 274 тысячы рублёў.

Алеся Бяляцкага затрымалі ў Мінску 4 жніўня. У той жа дзень у яго кватэры, а таксама на лецішчы ў Ракаве прайшлі ператрусы. Вобшук адбыўся і ў офісе Праваабарончага цэнтра «Вясна». Увечары 4 жніўня Бяляцкага даставілі на допыт у Дэпартамент фінансавых расследаванняў Міністэрства па падатках і зборах. 12 жніўня праваабаронцу прад'явілі абвінавачанне паводле ч. 2 арт. 243 КК РБ (утойванне прыбыткаў у асабліва буйным памеры), тэрмін утрымання пад вартай Бяляцкага быў працягнуты да двух месяцаў. Скаргі адваката Бяляцкага на абраную меру стрымання ў выглядзе ўтрымання пад вартай спачатку следства, а потым і суд, куды была перададзена справа, пакінулі без задавальнення.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# СІТУАЦЫЯ СА ЗНЯВОЛЕНЫМІ ПАГАРШАЕЦЦА

Генадзь КЕСНЕР

**Сітуацыя з палітычнымі зняволенымі, якія зараз адбываюць пакаранне ў месцах пазбаўлення волі, апошнім часам пагоршылася. Пра гэта на прэс-канферэнцыі казалі жонкі экс-кандыдатаў у прэзідэнты Андрэя Саннікава Ірына Халіп, Мікалая Статкевіча Марына Багдановіч, а таксама жонка Зміцера Бандарэнкі Вольга.**



Фота аўтара

Справа налева: Вольга Бандарэнка, Марына Багдановіч, Ірына Халіп, Андрэй Бандарэнка

Па словах Ірыны Халіп, якая сама правяла больш за месяц у СІЗА КДБ за падзеі 19 снежня, апошнім часам узмацніўся ціск на яе мужа, які зараз чамусьці знаходзіцца ў памяшканні камернага тыпу. «Спачатку да мужа ў камеру пасадзілі чалавека, хворага на сухоты, прычым, мы не ведаем, закрытую ці адкрытую форму хваробы ён мае. Прозвішча гэтага чалавека — Санец», — распавяла журналістка.

Кіраўнік інфармацыйна-асветніцкай установы «Платформа», былы палітзняволены, а зараз праваабаронца Андрэй Бандарэнка паведаміў, што менавіта гэтага чалавека падсаджвалі і да яго ў камеру. Ірына Халіп таксама адзначыла, што Саннікава хацелі пасадзіць разам з людзьмі самай нізкай сацыяльнай турэмнай касты. «Андрэй адразу заявіў, што абвяшчае сухую галадоўку. Ён запатрабаваў перавесці яго хоць у карцар, хоць расстраляць… Гэта такая тактыка адміністрацыі калоніі — прадэманстраваць, што з ім могуць паступіць так альбо гэтак. Яны могуць учыніць якія-небудзь правакацыі, каб дадаць нашым мужам новы тэрмін, могуць падкінуць наркотыкі. Рэжым не спыніцца нават перад ліквідацыяй палітвязняў», — заявіла Ірына Халіп.

Як распавяла грамадзянская жонка Мікалая Статкевіча Марына Багдановіч, 30 кастрычніка з кароткіх, літаральна хвілінных тэлефонных размоў Статкевіча з бацькам і дачкой стала вядома, што з 28 кастрычніка на яго ўзмацніўся ціск, каб дабіцца падпісання прашэння аб памілаванні. За адмову ад падпісання гэтага прашэння Статкевіча пазбавілі спатканняў на паўгода. Сваёй дачцэ палітвязень паспеў сказаць, што з ім можа здарыцца ўсё, што заўгодна.

З першага за тры месяцы ліста ад Мікалая Статкевіча, які атрымала Марына Багдановіч, стала вядома, што пералом рабрыны палітык атрымаў падчас працы на лесапілцы яшчэ ў жніўні. «Прычынай стала грубае парушэнне адміністрацыяй калоніі правілаў тэхнікі бяспекі: Статкевічу не выдалі спецвопратку для працы на лесапілцы. Мікалай быў вымушаны працаваць у гумавых сланцах, — адзначыла Марына Багдановіч. — Пасля гэтага ажно да 5 верасня ён са зламанай рабрынай быў вымушаны цягаць здараненыя бярвенні, пакуль не атрымаў новую траўму — яму расціснула руку. Улічваючы, што перад гэтым з'явілася публікацыя звароту Статкевіча да дэмакратычных сіл Беларусі, у мяне ўзнікаюць сумненні наконт выпадковасці гэтых траўмаў».

Спасылаючыся на словы людзей, якія пакінулі калонію, дзе знаходзіцца Статкевіч, Марына Багдановіч распавяла, што палітык быў ізаляваны ад іншых зняволеных, ён перасоўваецца па тэрыторыі пад канвоем, на яго спрабуюць «натравіць» іншых зняволеных. Так, лісты Статкевіча зачытваюцца публічна перад атрадам, пасля чаго знішчаюцца, пры гэтым пакаранне накладаецца на ўвесь атрад — напрыклад, у выглядзе спілавання турніка ў атраднай зоне, альбо ў выглядзе пазбаўлення ўсяго атраду ці нават усёй калоніі тэлефанаванняў. Марына Багдановіч таксама адзначыла, што адміністрацыя калоніі №17 горада Шклова ў асобе начальніка гэтай папраўчай установы Ермаліцкага ўжо больш за чатыры месяцы перашкаджае ў рэгістрацыі іх шлюбу з Мікалаем Статкевічам.

Па словах жонкі даверанай асобы Андрэя Саннікава Зміцера Бандарэнкі Вольгі, пасля аперацыі на хрыбце і этапавання ў папраўчую калонію №15 горада Магілёва яе муж знаходзіцца ў медсанчасці калоніі.

«Нягледзячы на патрабаванні падпісаць прашэнне аб памілаванні і адмовы Зміцера, напачатку да яго даходзілі лісты, яму былі дазволены тэлефанаванні, адбылося нават адно кароткатэрміновае спатканне. Зараз усё змянілася. Апошні атрыманы ліст датаваны 17 кастрычніка, у гэтым лісце Зміцер піша, што яго перавялі ў памяшканне карантыну, а на наступны дзень перавялі ў атрад №18. Адміністрацыя калоніі пайшла па праверанай шляху — няма лістоў, было адмоўлена ў тэлефонным званку, аб дазволе на які Зміцер паспеў паведаміць адвакату. Пры наведванні калоніі ў медсанчастцы казалі, што ў сярэдзіне менавіта бягучага тыдня, то бок з 31 кастрычніка да 6 лістапада, яго павінны вярнуць у медсанчастку. На мой званок у калонію мне адказалі, што ў медсанчастцы няма гарадскога тэлефона, што інфармацыю аб пераводзе яны не даюць. Мне параілі пісьмова звярнуцца да начальніка калоніі, і я атрымаю адказ ва ўстаноўлены тэрмін. Але мы ведаем, што гэты тэрмін — месяц. Таму пра тое, што адбываецца са Зміцерам менавіта зараз, я нічога не ведаю», — паведаміла Вольга Бандарэнка.

Паводле яе слоў, Зміцеру пасля аперацыі нельга нахіляцца, нельга доўга знаходзіцца ў статычных позах — стаяць ці хадзіць. Тым не менш, кажа Вольга, кіраўніцтва калоніі ўжо прапаноўвала яму пачаць працаваць. «Не ведаю, наколькі маральна прапанаваць працаваць, месці двор чалавеку, які ходзіць з мыліцай і які перанёс такія складаныя аперацыі. Яго могуць проста зрабіць інвалідам», — адзначыла жонка палітвязня.

Кіраўнік «Платформы» Андрэй Бандарэнка паведаміў і пра ўзмацненне ціску на старшыню зарэгістраванага ў Чэхіі «Маладога фронту» Зміцера Дашкевіча, якога таксама прымушаюць падпісаць прашэнне аб памілаванні.

Журналістка Ірына Халіп ад імя сваякоў і блізкіх палітзняволеных, у тым ліку і нявесты лідара «Маладога фронту» Зміцера Дашкевіча Насты Палажанкі звярнулася да прадстаўнікоў папяровых сродкаў масавай інфармацыі. «Газеты — гэта адзінае, што даходзіць у калоніі, гэта адзінае, што атрымліваюць на «зонах», у турмах. Усе зняволеныя чытаюць літаральна кожную фразу, кожную літару, любое ўзгадванне пенітэнцыярнай сістэмы з'яўляецца для іх вельмі важным. Спадары журналісты, калегі! Калі ласка, пішыце пра нашых мужоў, падтрымлівайце іх! Гэта вельмі і вельмі важна для іх там, дзе яны знаходзяцца», — зазначыла Ірына Халіп.

Марына Багдановіч звярнулася да чытачоў як газет, так і электронных мас-медыя. «Пішыце нашым хлопцам! І незалежна ад таго, якую колькасць лістоў яны атрымаюць і ці атрымаюць увогуле, гэта ўсё роўна вельмі моцны псіхалагічны чыннік уціску перад усім на адміністрацыю калоній. Калі ласка, не забывайцеся на палітзняволеных», — падкрэсліла Марына Багдановіч.

Жонкі палітвязняў падрыхтавалі зварот на імя кіраўнікоў краін Еўрапейскага саюза. У гэтым звароце яны патрабуюць не аслабляць ціск на кіраўніцтва Беларусі. «Тут няма ніякай лібералізацыі, краіна фактычна апынулася ў стане гуманітарнай катастрофы», — адзначаюць аўтары дакумента.

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# ЗАПРАШЭННЕ БЫЦЬ СВІННЁЙ



**Старшыня Нацбанка Беларусі Надзея Ермакова сказала, што для атрымання грашовага крэдыту ад Міжнароднага валютнага фонду трэба, каб усе палітычныя вязні сышлі з турмаў. Але ж яны самі не хочуць.**

Сітуацыя ну проста як у той фальклорнай кабеты, якая не ведае, што рабіць са свіннямі, якія зламалі плот ды папсавалі грады. З аднаго боку, трэба іх адлупцаваць ды ў катух загнаць. Але ж калі надышоў час забіваць, хай свінчо не крыўдзіцца, а вылазіць. Гаспадар вунь шыла вострыць, гаспадыня ваду грэе, і два суседскія дзецюкі прышлі з вяроўкай, каб дапамагчы цягнуць свінню на дошкі — смаліць, мыць, дзяліць. Кумпякі асобна, паляндвіцы асобна.

Ужо і чарка «за свежаніну» выпіта, а свінчо не спяшаецца. Нешта яно сабе думае.

Вось такая святая прастата, як паслухаеш, уласціва найноўшай фінансавай лэдзі краіны. Чыстае прагматычнае стаўленне да людзей, як і ў яе галоўнага працадаўцы.

Да людзей — як да свіней.

Здавалася, дзівіцца няма чаму. У нашай краіне ўладныя асобы слоў для абразы апанентаў не шукаюць. Але тут выпадак надзвычайны ў сэнсе сваёй арганікі. Ніяк не можа ўявіць спадарыня, што нехта адважыцца не паслухаць галоўнага спадара. Нават тыя, якіх ён без прычыны кінуў у турмы, а зараз вызваляе, бо зарабіць хоча...

Але галоўнай фінансавай лэдзі далёка да так званага галоўнага сенатара. Хачу, каб усе адчулі сітуацыю. Беларускі ўрад праводзіць свае пасяджэнні ў адпаведным доме, які месціцца за плячыма помніка Леніну. Аднаго з самых знакамітых тэрарыстаў і палітычных забойцаў усіх часоў і народаў. Для якога не існавала ніякай законнасці, апроч рэвалюцыйнай. Прынцыпова. Ніякіх судоў, следства, пракурорскага нагляду. Філосафаў — выгнаць з краіны (пашкадаваў!), паэтаў — расстраляць, некалькі соцень папоў — павесіць, царкоўную маёмасць — канфіскаваць.

Як разважаў Уладзімір Ільіч, гэта трэба зрабіць менавіта зараз, калі па дарогах валяюцца тысячы памерлых ад голаду людзей. Каб астатнія адчулі высокі гуманізм рабоча-сялянскай улады. І падтрымалі ў якасці асноўнага для жыцця прынцып рэвалюцыйнай мэтазгоднасці. Суседа забралі — радуйся, што не цябе. Цябе забралі — сам вінаваты, што папаўся.

Наша дзяржава ўжо колькі год жыве па законах надзвычайнага становішча, хоць ніколі афіцыйна яго не абвяшчала. Таму яе стала надзвычай многа, яна пішчом лезе ў кожную дзірку. Куды трэба і не трэба, куды ўвогуле лезці забаронена. А на самай справе, дзяржава прыватызавана так званай уладнай вертыкаллю. Статусныя месцы ў ёй займаюць людзі малапісьменныя. Яны прынялі на сябе столькі функцый, прысвоілі столькі паўнамоцтваў, і не ведаюць, што з гэтым багаццем рабіць.

Закон аб надзвычайным становішчы, які дазваляе пры розных катаклізмах ужываць дзяржаўны прымус у адносінах да грамадзян і арганізацый у пашыраным маштабе. Раптам паляк ці эстонцы на нас нападуць, ці расійскія дыверсанты адключаць электрычнасць падчас тэлевізійнай прамовы Лукашэнкі. Неабходнасць такога закона зразумелая ўсім, і ніякага пярэчання не выклікае.

Чаму ж тады вертыкальшчыкам хочацца большага? Каб нават гурток філатэлістаў даваў тлумачэнні наконт сваёй дзейнасці так званым органам правапарадку?

Вось прынялі папраўкі да закону аб КДБ. Цяпер без дазволу «слаўных чэкістаў», ніхто нават марку на паштоўку не зможа наклеіць. Чаму?

На думку акадэміка, таму што па ўсім свеце ідзе хваля пратэстаў. І замежныя ўлады змушаны страляць па пратэстантах гумавымі кулямі, выкарыстоўваць вадамёты, біць людзей дубінкамі. З той нагоды, што загадзя не прынялі меры, не вызначылі парадак правядзення масавых мерапрыемстваў. А вось такія спікеры-акадэмікі, што праседжваюць лавы ў двухпалатным беларускім парламенце, ужо ўсе вызначылі. Цяпер гумавая куля трапіць у пратэстанта не на плошчы, а як толькі ён выйдзе з уласнай кватэры.

На думку акадэміка, так яно і мае быць. Каб не было магчымых правакацый падчас акцый, каб не стваралася пагрозы жыццю і здароўю іншых людзей.

Ну што на гэта скажаш? Можна было б разгарнуць Канстытуцыю нават у розных яе рэдакцыях, можна было б працытаваць закон аб надзвычайным становішчы… Але ж нашто — у краіне, дзе ўлады не прытрымліваюцца законаў, юрыдычны факультэт, як лічыў Юры Дамброўскі, з'яўляецца «факультэтам лішніх рэчаў».

Святая, можна сказаць, акадэмічная, прастата. Але тая бабулька, што падкладвала палена ў вогнішча, на якім палілі ерэтыка, была больш шчырай. Бо не ведала, што робіць. А ў нашым выпадку даводзіцца ці лічыць усіх паважаных дзеячаў дурнямі, ці пагаджацца самому на ролю свінні, якую цягнуць з хлеўчука на кілбасы.

▸ РОЗДУМ

# ЖАНЧЫНА-ПРЭЗІДЭНТ — БЯДА ЦІ ШАНЕЦ?

Вольга ХВОІН




**Нядаўна Аляксандр Лукашэнка зрабіў гучную заяву, што ў прэзідэнцкім крэсле жанчыне не месца. Маўляў, нядобрая гэта справа нагружаць жанчыну такой цяжкай працай ды змушаць яе ваенныя парады ў спадніцы прымаць. Ці ёсць шанцы ў беларускі стаць не проста першай лэдзі, а першай асобай дзяржавы, ці яе наканаванне варыць боршч?**

## Трэнд сезону: вары боршч!

У найноўшай гісторыі незалежнай Беларусі сапраўды быў толькі адзін выпадак, калі жанчына паспрабавала замахнуцца на прэзідэнцкую пасаду. Гэта дачка Пятра Машэрава — Наталля. Філолаг паводле адукацыі, яна вылучала сваю кандыдатуру на прэзідэнцкіх выбарах 2001 года. Ініцыятыўная група Машэравай была зарэгістраваная, але да завяршэння тэрміну збору подпісаў яна адклікала сваю заяву. Кажуць, што на Наталлю Пятроўну націснулі афіцыйныя ўлады.

Жанчыны-прэзідэнта Беларусь пакуль не мела, затое мела нямала жанчын-дэпутатак парламенту і мясцовых саветаў, чыноўніц, кіраўніц Нацыянальнага банка. Ёсць і легенды сучаснасці — кіраўніца Цэнтрвыбаркаму Лідзія Ярмошына, намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта, памочнік прэзідэнта Наталля Пяткевіч.

А яшчэ ёсць жанчыны-суддзі, жанчыны-выканаўцы. Фактычна на ўсіх палітычных працэсах «беларуская Феміда» працавала менавіта ў жаночым аблічы, рэалізуючы волю мужчын, што знаходзяцца ва ўладзе. А на месцах жанчыны-чыноўніцы шукалі шляхі і метады зноў-такі рэалізацыі чужой палітычнай волі. «Мне сорамна за мужчын, бо мы бачым прыкрую практыку — хавацца за жаночыя спіны, — кажа старшыня грамадскай арганізацыі «Беларуская жаночая ліга» Ніна Стужынская. — Мужчыны больш дальнабачныя і ведаюць, што за гэтыя прысуды рана ці позна давядзецца адказваць, ім такая перспектыва не падабаецца, і на брудныя ролі адпраўляюць жанчын».

Напрыклад, адзін з палітычных эмігрантаў гэтага сезону распавядаў, як у невялікім гарадку, дзе ён жыў і меў свой бізнэс, разам са знаёмай чыноўніцай абмяркоўваў, як яго пакараць за палітычную дзейнасць. Бо загад зверху паступіў, не выканаць яна яго не магла, але і вялікай шкоды свайму знаёмаму рабіць не хацела. Атрымліваецца, што жанчына ў сістэме ўлады (ды і не толькі жанчына) цяпер на правах жаўнера, які мусіць забяспечваць перамогі генералу, загады не абмяркоўваць і сваю прысутнасць без асаблівай патрэбы не праяўляць. «Жанчына мусіць варыць боршч, а не шастаць па плошчах», — вось лозунг цяперашняга часу, сфармуляваны Ярмошынай.

> Адам Міцкевіч свой знакаміты верш «Смерць палкоўніка» прысвяціў удзельніцы паўстання 1830–1831 гадоў Эміліі Плятэр. Яна сабрала атрад у 400 чалавек, якія дзейнічаў на тэрыторыі Віцебшчыны. Загінула ў 25 гадоў. Паплечнік Эміліі знакаміты Ігнат Дамейка пасля стаў нацыянальным героем Чылі.
>
> * * *
>
> У гісторыі беларускага нацыянальна-вызвольнага руху пачатку XX стагоддзя цяжка знайсці больш яркую жаночую асобу, чым Палута Бадунова. Яна — адзіная жанчына, чыё імя фігуруе ў спісах амаль усіх нацыянальна-палітычных арганізацый ад 1917 года. Галоўнай марай яе жыцця было ўбачыць Беларусь суверэннай і незалежнай. Палута Бадунова ўваходзіла ў склад урада Беларускай Народнай Рэспублікі, у кіраўніцтва найстарэйшай беларускай палітычнай партыі — Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ). З-за цяжкай хваробы ўжо ў сярэдзіне 1920-х гадоў Бадунова адышла ад палітычнай дзейнасці, была зламана фізічна, жыла на ўтрыманні сястры. Нягледзячы на гэта ў 1937 годзе яе арыштавалі, і з засценкаў НКУС яна ўжо не выйшла: у 1938 годзе Палуту Бадунову расстралялі.

## Нам бы такую цётачку!

Летам 2010 года Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД) праводзіў даследаванне на тэму гендэрнай спецыфікі электаральных перавагаў. Аналітыкі НІСЭПД таксама прымалі да ўвагі досвед суседніх краін, дзе жанчыны змаглі скарыць палітычны алімп. Але беларуская рэальнасць, паводле сацыёлагаў, зусім іншая. Як паказала апытанне, падтрымка электаратам жанчын-кандыдата застаецца вельмі нязначнай — усяго 6,6% выбаршчыкаў выказалі гатоўнасць прагаласаваць за жанчыну (за мужчыну — 42,7%, яшчэ 46% заявілі, што пол кандыдата для іх значэння не мае).

Выказванняў на карысць жанчыны-кандыдата было ў тры разы менш, чым супраць яе — 18,2% і 55,6%, адпаведна. Такім чынам, цяперашняе беларускае грамадства пакуль не гатова падтрымаць ідэю наконт жанчыны-прэзідэнта, — рэзюмуюць аналітыкі НІСЭПД.

Ніна Стужынская мяркуе, што прыход жанчыны да ўлады быў бы пазітыўнай з'явай для Беларусі, праўда, умовы для палітычнай дзейнасці цяпер неспрыяльныя, таму адкрытае пытанне, хто захоча быць той смелай і адчайнай…

«Я не маю нічога супраць жанчыны-палітыка, — кажа Стужынская. — Паглядзіце, колькі жанчын абіраецца на мясцовых выбарах, дзе няма грошай, няма вялікіх паўнамоцтваў, — гаворыць Ніна Стужынская. — У вышэйшых эшалонах улады жанчын фактычна няма. Наша грамадства патрыярхальнае і негатыўна ставіцца да жанчын на самым версе ўлады. Мяркую, што дзеючы палітычны лідар не толькі жанчыну не бачыць у сваім фатэлі, а ўвогуле нікога апроч сябе. Сёння нішто не перашкаджае жанчыне займацца палітыкай, але ў нецывілізаваным грамадстве гэтая дзейнасць нясе пагрозу жыццю, здароўю. Канешне, жанчыны больш асцярожныя, бо ім ёсць чым ахвяраваць — сям'я, дзеці. І ўсё ж, думаю, фігура жанчыны была б запатрабаванай і папулярнай як альтэрнатыва агрэсіўнаму стылю Лукашэнкі. Хацелася б ужо спакойнага кіраўніцтва, прадказальнасці».

Спадарыня Стужынская нават абмалявала партрэт патэнцыйнай кандыдаткі ў прэзідэнты, якая б магла займець прыхільнасць электарату: «Жанчына сталага ўзросту. Думаю, у нас не пройдзе варыянт Цімашэнкі — у адным флаконе мадэль і маці нацыі. Гэтая кандыдатка ў прэзідэнты не мусіць выклікаць з боку жанчын-выбарцаў рэўнасці. Яна — маці дарослых дзяцей, мае добры кар'ерны шлях, магчыма, наменклатурны. Асоба ў нечым падобная на фінскага прэзідэнта Тар'ю Халанен, я бачыла яе асабіста і адразу ж падумала: «Вось нам бы такую цётачку ў кіраўнікі!»

## Чаму б і не?

Патрыярхальнае кансерватыўнае грамадства нервова рэагуе на жанчыну, што ідзе поруч з мужчынам. І тым больш, калі яна пачынае падымацца на адну прыступку са сваім спадарожнікам. Жонку экскандыдата Аляксандра Мілінкевіча Іну Кулей абвінавачвалі ў тым, што яна кіруе ўчынкамі свайго мужа, смелую і адчайную Ірыну Халіп нават Аляксандр Лукашэнка абвінаваціў у тым, што яна імкнулася на месца першай лэдзі і ўсяляк падбухторвала да гэтага свайго мужа Андрэя Саннікава.

Жанчыны, якія маюць досвед у беларускай палітыцы, не адмаўляюць таго факту, што мужчыны часта глядзяць на іх з адпаведнай заніжанай ацэнкай. Людміла Гразнова цяпер займаецца праваабарончай дзейнасцю, дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13 склікання, намеснік старшыні Камісіі па бюджэце, падатках, банках і фінансах, у 1996 годзе была ў ліку тых, хто падпісаўся пад зваротам групы дэпутатаў у Канстытуцыйны суд з патрабаваннем адхілення прэзідэнта Лукашэнкі ад улады.

«У беларускай палітыцы дзве крайнасці — з афіцыйнага боку ёсць адзін чалавек у акружэнні світы. Іншы бок — палітыка дысідэнцкая, апазіцыйная. На афіцыйным подыюме жанчыны ствараюць дэкаратыўны фон, і ўлада гэтым добра карыстаецца, бо глядзець увесь час на адзін твар стамляе. А прыгожыя жаночыя вочкі разбаўляюць цьмяны афіцыёз, — разважае Людміла Гразнова. — У апазіцыйнай палітыцы таксама мае месца тыповая хвароба нашага грамадства — патрыярхальнасць. Некаторыя палітыкі-мужчыны пераносяць сваё светабачанне і на прафесійную дзейнасць. Як у побытавым жыцці ўспрымаюць жанчыну ў ролі прыслугі, так і ў палітычнай дзейнасці, паводле іх меркавання, жанчына мусіць абслугоўваць».

Людміла Гразнова — сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі, ад 1995 года — сябра палітрады АГП, ад 2004 года — намеснік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі, ад 2003 года — старшыня «Праваабарончага альянсу», кандыдат эканамічных навук. Дасягненні на полі прафесійным і грамадскім сапраўды немалыя. «У свой час у мяне была бліскучая палітычная кар'ера, гэта быў узлёт на пачатку 1990-х гадоў. Я магла прамаўляць да людзей з трыбуны Вярхоўнага савета, але і пасля змагла выкарыстоўваць свае веды ў карысным рэчышчы. У любым разе я ніколі не кажу непрыемных слоў на адрас мужчын, што часам можна пачуць ад нашых феміністак. Нельга ўсё бачыць у чорна-белым свеце, бо мы не можам пераскочыць праз стан нашага грамадства», — рэзюмуе спадарыня Гразнова.

Яшчэ адна асоба, што цвёрда трымаецца на смутным палітычным небасхіле Беларусі, — Наста Палажанка. Намесніца старшыні арганізацыі «Малады Фронт» у грамадска-палітычную дзейнасць прыйшла ў падлеткавым узросце. За гэты час і ў вязніцы пасядзела, і мудрасці жыццёвай набралася. Хаця крый Божа беларускіх палітыкаў абодвух палоў ад такога досведу.

Наста не адмаўляецца ад прызначэння жанчыны глядзець сям'ю, але мяркуе, што як стае таленту і магчымасцяў, то і на палітычныя вяршыні можна замахнуцца.

«У нас не толькі жанчын не хапае для гэтага служэння, для прэзідэнцтва. У нас наогул не развітая палітычная культура, каб была магчымасць марыць пра такую кар'еру, каб было разуменне, што пасада прэзідэнта — гэта не недасяжнасць, а абсалютна рэальная мэта, на якую варта працаваць, калі ты здольны нешта рабіць у гэтым кірунку, бачыш у сабе такі патэнцыял», — перакананая Наста.

Дзяўчыне ўсяго 21 год, яна не адмаўляе таго, што «сям'я і дзеці — гэта першае пакліканне жанчыны. Але пры гэтым ніхто не забараняе жанчыне імкнуцца да лідарскіх пазіцый, і пасля таго, як яна ўладкавала сям'ю, паспрабаваць уладкаваць дзяржаву».

«Я б задавальненнем прагаласавала б за кандыдата-жанчыну, — кажа Палажанка. — І нават мяркую, што гэта неабходна Беларусі, бо абывацеля ў нас вельмі складана нечым зацікавіць. Перакананая, што моцная жаночая асоба выклікала б інтарэс, прымусіла б узняць вочы і, як мінімум, прачытаць біяграфію ды паслухаць колькі прамоў. Пачалася б дыскусія, ці можа ўвогуле жанчына займацца палітычнай дзейнасцю, але дзе ёсць дыскусія, там ёсць жыццё і магчымасць дакапацца да ісціны. Я б звярнула ўвагу на каштоўнасці, што нясе гэты чалавек, ці мае яна сям'ю, час і здольнасці ўладкаваць сваё жыццё. Безумоўна, мяне б цікавілі яе біяграфія і планы на будучыню. І для мужчыны, і для жанчыны былі б важныя таленавітасць, прынцыповасць, мужнасць у прыняцці рашэнняў».

Наста не адмаўляе, што і сама аднойчы паспрабуе балатавацца ў прэзідэнты: «Мяркую, варта адштурхоўвацца ад таго, што я буду мець на той час, ці буду насамрэч мець да гэтага здольнасці і моц. Калі на той момант я буду перакананая, што гэта маё, што я маю дастаткова багажу, каб падняцца на такі ўзровень, узяць на сябе адказнасць, то чаму б і не?»

7

# TV ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 7 ЛІСТАПАДА, ПАНЯДЗЕЛАК

06.20 Мультфільмы.
07.00 Добрай раніцы, Беларусь!
09.00, 12.00, 15.00 Навіны.
09.15 У цэнтры ўвагі.
10.10 Драма «Сорак першы» (СССР).
12.10 Меладрама «Масква слёзам не верыць» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
15.10 Навіны рэгіёна.
15.30 Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
16.35 Арэна.
16.55 Музычны эстрадны спектакль «Хлапечнік».
18.30 Лірычная камедыя «Пакроўскія вароты» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
21.00 Панарама.
21.45 «Ёсць ідэя!». Адмысловы рэпартаж АТН.
22.00 Меладрама «Пра любоff» (Расія).
00.05 «Лістапад-2011». Дзённік.
00.20 Камедыйны баявік «Супергеройскае кіно» (ЗША).
01.45 Дзень спорту.

07.00 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
08.00, 09.00 Нашы навіны.
09.05 Камедыя «Максім Перапяліца».
10.40 «Лідзія Федасеева-Шукшына. Пра каханне, пра дзяцей, пра сябе…».
11.40 Фільм «Каліна чырвоная».
13.30 Тэлечасопіс «Звяз».
14.05 Фільм «Кубанскія казакі».
16.00 Нашы навіны (з субтытрамі).
16.15 Навіны спорту.
16.20 «Вясёлыя рабяты-артысты і наглядчыкі».
17.20 «Вясёлыя рабяты».
19.05 «Вечар В.Кікабідзэ».
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 «Гумар FM».
23.15 Фільм «Табар сыходзіць у неба».

06.00 «Званая вячэра».
06.30 «Раніца.Студыя добрага настрою».
08.30 «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
09.40 «Вялікі сняданак».
10.20 Фільм «Карчма на Пятніцкай». СССР, 1977 г.
12.00 «Вялікі горад».
12.35 «Званая вячэра».
13.30 Фільм «Няўлоўныя Мсціўцы» і «Новыя прыгоды няўлоўных», СССР, 1968 г.
16.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 Фільм «Карона Расійскай імперыі, або зноў няўлоўныя». СССР, 1970 г.
19.30 «24 гадзіны».
20.00 Фільм «Брат 2». ЗША - Расія, 2000 г.
22.30 Фільм «Служылі два таварышы». СССР, 1968 г.
00.10 «Сталічны футбол».

06.25 Гістарычны дэтэктыў «Вершнік з імем Смерць» (Расія).
08.20 Тэлебарометр.
08.25 Камедыя «Самая абаяльная і прывабная» (СССР).
10.00 Музычны фільм-казка «Пра Чырвоны Капялюшык» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
12.25 Навіны надвор'я.
12.55 Серыял «Маргоша» (Расія).
17.10 «Мой лёс - «Харошкі»! Канцэрт.
18.40 Фільм-катастрофа «Экіпаж» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
21.05 Тэлебарометр.
21.20 КЕНО.
21.25 Рамантычная камедыя «Новы хлопец маёй мамы» (Германія-ЗША).
23.15 Авертайм.
23.45 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.

### РОССИЯ

07.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Карціна свету».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00 Весткі.
11.30 Тэлесерыял «Маршрут літасці».
12.25 «Ранішняя пошта».
12.55 «Пакой смеху».
14.00 Весткі.
14.30 «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
15.30 «З новай хатай!». Ток-шоў.
16.30 «Кулагін і партнёры».
17.00 Весткі.
17.35 Весткі. Дзяжурная частка.
17.50 Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
18.50 «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
20.00 Весткі.
20.30 «Прамы эфір».
21.35 Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі-3».
23.25 Тэлесерыял «Ліквідацыя».
00.25 «НЛА Трэцяга рэйха». Дакументальны фільм.

### НТВ

06.00 Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
08.35 «Прыходзьце ў мой дом. Віка Цыганова» Фільм-канцэрт.
09.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
10.00 Сёння.
10.20 «Інвестыцыі ў рэвалюцыю».
11.10 «Да суду».
12.05 «Суд прысяжных».
13.00 Сёння.
13.25 «Судовы дэтэктыў».
14.25 «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
15.10 «Справа густу».
15.40 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.00 Сёння.
16.25 «Пракурорская праверка».
17.40 «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
18.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.00 Сёння.
19.35 Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
21.25 Дэтэктыўны серыял «Пятніцкі».
23.15 «Сёння. Вынікі».
23.40 «Сумленны панядзелак».
00.30 «Школа зласлоўя». Ток-шоў.
01.10 Серыял «Школа».

### EUROSPORT

09.30 Матаспартыўны часопіс.
09.45 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе турынг. Кітай. Раўнд 22.
10.45 Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Пары. Кароткая праграма (Кітай).
11.45 Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Пары. Адвольная праграма (Кітай).
12.30 Марафон. Нью-Йорк (ЗША).
13.45 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 62 кг. Парыж (Францыя).
15.00 Live. Шары. Адчынены чэмпіянат Шатландыі. Перт (Шатландыя). Дзень 3-і.
18.30 Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
19.30 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 62 кг. Парыж (Францыя).
20.00 Live. Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 58 кг. Парыж (Францыя).
21.45 Вось дык так!!!
22.00 Пра рэстлінг. Агляд WWE.
22.30 Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
23.30 Еўраспорт. Пад грыфам «Сакрэтна». Часопіс.
00.00 Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
01.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 58 кг. Парыж (Францыя).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

07.00 Тыдзень у «Аб'ектыве».
07.40 Зона «Свабоды» (аналітычная праграма).
08.10 «Малая Масква», серыял: 4 серыя.
08.55 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
09.10 ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
09.35 Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
10.05 «Пад покрывам нябёсаў», маст. фільм, 1990 г., ЗША–Італія–Вялікабрытанія.
12.20 Дакументальная гадзіна: «Праблема з камарамі ды іншыя гісторыі», дак. фільм, 2007 г., Балгарыя.
13.20 Зона «Свабоды» (аналітычная праграма).
13.55 Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
14.20 ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
14.45 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
15.05 Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
15.15 «Малая Масква», серыял: 4 серыя.
15.55 Дакументальная гадзіна: «Праблема з камарамі ды іншыя гісторыі», дак. фільм, 2007 г., Балгарыя.
17.00 «Таямніца Сагалі», серыял: 4 серыя.
17.25 Зона «Свабоды» (аналітычная праграма).
18.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
18.05 Дакументальная гадзіна: «Праблема з камарамі ды іншыя гісторыі», дак. фільм, 2007 г., Балгарыя.
19.05 Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
19.15 Моўнік (лінгвістычная праграма).
19.30 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
19.40 Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
19.50 Калыханка для самых маленькіх.
20.00 Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
20.30 Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
20.35 Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «7 разоў Масква», дак. фільм, Польшча.
21.00 Аб'ектыў (галоўнае выданне).
21.25 Рэмарка (культурніцкая праграма).
21.50 «Пад покрывам нябёсаў», маст. фільм, 1990 г., ЗША–Італія–Вялікабрытанія.
23.00 Аб'ектыў.
23.25 Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

## 8 ЛІСТАПАДА, АЎТОРАК

06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35 Добрай раніцы, Беларусь!
07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.30 Навіны.
07.30, 08.30 Дзелавое жыццё.
09.10 Дэтэктыўны серыял «Лігаўка».
10.10 «Андрэй Грамыка». Дак. фільм.
11.00 Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон» (Украіна-Расія).
12.10 Арэна.
12.35 «Лістапад-2011». Дзённік.
12.45 «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
13.00 Дак. цыкл «У пошуках ісціны».
13.55 «Толькі жанчына ведае». Ток-шоў.
15.15, 19.15 Навіны рэгіёна.
15.25 «Ёсць ідэя!». Адмысловы рэпартаж.
15.40 Скрынка перадач.
16.10 Мастацка-публіцыстычны фільм «Эпоха. Падзеі і людзі».
16.55 Серыял «Знахар» (Расія). 1-я серыя.
17.55 Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон-2» (Украіна-Расія). 1-я серыя.
18.45, 00.45 «Зона Х». Крымінальная хроніка.
19.30 «Сфера інтэрэсаў». Эканамічная праграма.
19.55 Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія). Заключная серыя.
21.00 «Панарама».
21.45, 00.55 Дзень спорту.
21.55 Актуальнае інтэрв'ю.
22.10 Прэм'ера. Драматычны серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША). 1-я серыя.
23.15 «Лістапад-2011». Дзённік.
23.30 Гістарычны серыял «Дасведчаная крыніца ў Маскве» (Расія). 1-я серыя.

06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10 Нашы навіны.
06.10 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
09.10 «Жыць здарова!».
10.20 «Зразумець. Прабачыць».
11.05 Навіны спорту.
11.10 «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
12.00 «Двух лёсаў лінія адна».
13.05 Навіны спорту.
13.10 «Хачу ведаць».
13.40 «Кантрольны закуп».
14.10 «Модны прысуд».
15.10 «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
16.10 Навіны спорту.
16.15 «Участковы дэтэктыў».
16.55 «Давай пажэнімся!».
18.15 Навіны спорту.
18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.
18.55 «Хай кажуць».
20.00 Час.
21.00 Навіны спорту.
21.05 «Чорныя ваўкі». Шматсер. фільм.
22.20 «Справа гастранома №1». Шматсерыйны фільм.
23.20 «Зараз у мяне ёсць усё».
00.20 «След».
01.40 Начныя навіны.

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
06.10 «Раніца.Студыя добрага настрою».
07.40 «СТБ-спорт».
07.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
08.30 Фільм «Гульня ў чатыры рукі». Францыя - Італія, 1980 г.
10.40 «Справа асобай важнасці».
11.30 «Званая вячэра».
12.20 «Зорны рынг».
13.50 Фільм «Брат 2». ЗША - Расія, 2000 г.
16.05 «Зялёны агурок. Карысная перадача».
16.50 «Сталічны футбол».
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.30 «Агонь кахання». Серыял.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, маляня».
20.25 Фільм «Імітатар». ЗША, 1995 г.
22.55 «СТБ-спорт».
23.00 «Жанчыны XX стагоддзя».
23.30 «Аўтапанарама».
23.55 «Хірамант 2». Серыял.
00.50 «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.

07.00 ЛАДная раніца.
08.00 Тэлебарометр.
08.05 Серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
09.05 Баявік «Бой з ценем» (Расія).
10.05 Альбарутэнія.
10.40 Канцэрт «Celine Dion. A New Day Live».
12.05 Рэпарцёр «Беларускай часіны».
12.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
13.50 Авертайм.
14.20 Халі-галі. Скетч-шоў.
14.45 Крымінальная драма «Зграя».
16.40 Прэм'ера. Дэтэктыў «Ілюзія палявання» («Беларусьфільм»). 1-я серыя.
17.55 Серыял «Ты маё жыццё».
18.55 Баскетбол. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
21.00 Калыханка.
21.15 Тэлебарометр.
21.20 КЕНО.
21.25 «Беларуская часіна».
22.30 Баявік «Бой з ценем» (Расія).
23.30 Спорт-кадр.
00.00 Рэальны свет.
00.30 Дэтэктыў «Ілюзія палявання» («Беларусьфільм»). 1-я серыя.

### РОССИЯ

07.00 «Раніца Расіі».
10.05 Тэлесерыял «Маршрут літасці».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Кулагін і партнёры».
12.00 Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі–3».
13.50 Навіны - Беларусь.
14.30 «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
15.25 «З новай хатай!». Ток-шоў.
16.20 «Кулагін і партнёры».
16.50 Навіны - Беларусь.
17.35 Весткі. Дзяжурная частка.
17.50 Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
18.50 «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
19.50 Навіны - Беларусь.
20.30 «Прамы эфір».
21.35 Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі-3».
23.25 Тэлесерыял «Ліквідацыя».
00.15 Навіны - Беларусь.
00.25 «Снежны чалавек. Апошнія відавочнікі». Дакументальны фільм.

### НТВ

06.00 Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
08.35 «Кватэрнае пытанне».
09.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
10.00 Сёння.
10.20 «Чыстасардэчнае прызнанне».
11.10 «Да суду».
12.05 «Суд прысяжных».
13.00 Сёння.
13.25 «Судовы дэтэктыў».
14.25 «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
15.10 «Справа густу».
15.40 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.00 Сёння.
16.25 «Пракурорская праверка».
17.40 «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
18.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.00 Сёння.
19.35 Прэм'ера. Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
21.25 Дэтэктыўны серыял «Пятніцкі».
23.15 «Сёння. Вынікі».
23.40 Серыял «Сталіца граху».
01.10 Серыял «Школа».

### EUROSPORT

09.30 Марафон. Нью-Йорк (ЗША).
10.30 Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
11.30 Вось дык так!!!
12.30 Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Кітая. Мужчыны. Адвольная праграма. Пекін (Кітай).
13.45 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 58 кг. Парыж (Францыя).
15.00 Live. Шары. Адчынены чэмпіянат Шатландыі. Перт (Шатландыя). Дзень 4-ы.
17.30 Live. Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 63 кг. Парыж (Францыя).
19.15 Еўраспорт. Пад грыфам «сакрэтна». Часопіс.
19.45 Вось дык так!!!
20.00 Live. Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 69 кг. Парыж (Францыя).
22.00 Бокс. Турнір Bigger's Better. Цяжкая атлетыка. Партугалія.
00.00 Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
00.15 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
00.45 Конны спорт. Часопіс.
01.15 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 69 кг. Парыж (Францыя).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

07.00 Аб'ектыў.
07.25 Гарачы каментар.
07.35 «Паніка», трылер, 2000 г., ЗША.
09.00 Рэмарка (культурніцкая праграма).
09.20 «Таямніца Сагалі», серыял: 4 серыя.
09.45 Еўропа сёння.
10.15 Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «7 разоў Масква», дак. фільм, Польшча.
10.35 Рэмарка (культурніцкая праграма).
10.55 МакраФон: XIV Фестываль песеннай паэзіі і аўтарскай песні «Бардаўская восень–2007»: выступ Алеся Камоцкага.
11.30 «Паэма веры», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
11.55 «Ранча», серыял: 2 серыя.
12.45 «Паніка», трылер, 2000 г., ЗША.
14.10 «Таямніца Сагалі», серыял: 4 серыя.
14.40 Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
15.05 Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «7 разоў Масква», дак. фільм, Польшча.
15.30 Рэмарка (культурніцкая праграма).
15.50 Моўнік (лінгвістычная праграма).
16.00 МакраФон: XIV Фестываль песеннай паэзіі і аўтарскай песні «Бардаўская восень–2007»: выступ Алеся Камоцкага.
16.30 «Паэма веры», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
17.00 «Тры шалёныя нулі», серыял: 7 серыя.
17.25 Вагон.
17.30 Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
18.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
18.05 «Арол», серыял: 15 серыя.
19.05 Два на два (тэледыскусія).
19.30 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
19.40 Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
19.50 Калыханка для самых маленькіх.
20.00 На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
20.30 Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
20.40 «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
21.00 Аб'ектыў (галоўнае выданне).
21.25 Сальда (эканамічная праграма).
21.40 «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 6 серыя.
22.30 Басанож па свеце.
22.55 Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
23.20 Аб'ектыў.
23.45 Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

## 9 ЛІСТАПАДА, СЕРАДА

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.25** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія). Заключная серыя.
**10.10** Серыял «Знахар» (Расія). 1-я серыя.
**11.05** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон-2» (Украіна-Расія). 1-я серыя.
**12.10** «Сфера інтарэсаў». Эканамічная праграма.
**12.35** «Лістапад-2011». Дзённік.
**12.50** Драматычны серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША). 1-я серыя.
**13.50** «Толькі жанчына ведае». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Актуальнае інтэрв'ю.
**16.10** Мастацка-публіцыстычны фільм «Эпоха. Падзеі і людзі».
**16.55** Серыял «Знахар» (Расія). 2-я серыя.
**17.55** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон-2» (Украіна-Расія). 2-я серыя.
**18.45, 00.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Жыццё і прыгоды Мішкі Япончыка» (Украіна). 1-я серыя.
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45, 00.55** Дзень спорту.
**21.55** «Агарафобія». Адмысловы рэпартаж.
**22.10** Драматычны серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША). 2-я серыя.
**23.15** «Лістапад-2011». Дзённік.
**23.30** Гістарычны серыял «Дасведчаная крыніца ў Маскве» (Расія). 2-я серыя.

**06.00, 09.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Чорныя ваўкі». Шматсер. фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Прэм'ера. «Шчаслівыя разам». Шматсерыйны фільм.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Чорныя ваўкі». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**22.20** «Справа гастранома №1». Шматсерыйны фільм.
**23.20** Тэорыя неверагоднасці.
**00.10** «След».
**01.30** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінштчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Імітатар». ЗША, 1995 г.
**10.40** «Прагнасць».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Хірамант 2». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**16.50** «Прыгоды дылетанта».
**17.20** «Мінштчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Кіроўца для Веры». Расія - Украіна, 2004 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Мінск і мінчане».
**23.30** «Дабро пажалаваць».
**23.55** «Хірамант 2». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Баявік «Бой з ценем». Закл. серыя.
**10.05** Альбарутэнія.
**10.40** Канцэрт «Justin Timberlake. Live From Madison Square Garden».
**12.15** Рэальны свет.
**12.50** Спорт-кадр.
**13.25** Спартовая драма «Жалезныя гульні» («Беларусьфільм»).
**14.55** Дак. фільм «На шляху да поўнасці ўласцівасцяў» («Беларусьфільм»).
**15.45** Жаночая ліга.
**16.45** Дэтэктыў «Ілюзія палявання» («Беларусьфільм»). 2-я серыя.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Дэтэктыў «Гульня па-сур'ёзнаму» (Расія - Украіна).
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Спортлато 5 з 36».
**21.25** КЕНО.
**21.30** «Беларуская часіна».
**22.35** Баявік «Бой з ценем». Закл. серыя.
**23.40** Рэальны свет.
**00.10** Дэтэктыў «Ілюзія палявання» («Беларусьфільм»). 2-я серыя.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі–3».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі-3».
**23.25** Тэлесерыял «Ліквідацыя».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** «Выбары 2011. Дэбаты».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.25** Дэтэктыўны серыял «Пятніцкі».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Серыял «Сталіца граху».
**01.10** Серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**09.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**10.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны. 1/8 фіналу. Першы матч.
**11.15, 15.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны. 1/8 фіналу. Першы матч.
**12.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 63 кг. Парыж (Францыя).
**13.45** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 69 кг. Парыж (Францыя).
**16.00, 18.00** Live. Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны. 1/8 фіналу.
**20.00** Live. Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 69 кг. Парыж (Францыя).
**22.00** Абранае па серадах.
**22.10** Конны спорт. Верона (Італія).
**23.10** Навіны коннага спорту.
**23.15** Гольф. Чэмпіёны HSBC.
**23.45** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**23.50** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.00** Вось дык так!!!
**01.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны. 1/8 фіналу. Зваротны матч.
**01.45** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 69 кг. Парыж (Францыя).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**08.35** «Арол», серыял: 15 серыя.
**08.30** Два на два (тэледыскусія).
**09.00** «Тры шалёныя нулі», серыял: 7 серыя.
**09.30, 13.10** На колах.
**10.00, 16.30** Рэпартэр.
**10.25** Сальда (эканамічная праграма).
**10.40, 15.10** «Старадаўнія інструменты Беларусі», дак. фільм, 2007 г., Беларусь: ч. 3.
**10.55** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.05** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**11.20** «Ранча», серыял: 3 серыя.
**12.10** «Арол», серыял: 15 серыя.
**13.35** «Тры шалёныя нулі», серыял: 7 серыя.
**14.05** Эксперт.
**14.30** Сальда (эканамічная праграма).
**14.45** Два на два (тэледыскусія):.
**15.25** «Край светлых мрояў», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**16.15** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**17.00** «Ажыятаж вакол Басі», серыял.
**17.25** Невядомая Беларусь: «Катынь. Праз 70 гадоў», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Прыстань», дэтэктыўны серыял.
**18.50** «Бывай, зброя?», дак. фільм, 2010 г.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Праект «Будучыня».
**20.25** Навігатар.
**20.40** Хто ёсць кім?: «Беларусь – мой музей. Анатоль Белы».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Без рэтушы: «Малельнікі за ўвесь свет», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**21.45** «Каралева Бона», тэлесерыял, 1980 г., Польшча: 1 серыя.
**22.40** Два на два (тэледыскусія).
**23.05** Аб'ектыў.
**23.30** Гарачы каментар.

## 10 ЛІСТАПАДА, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.25** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Жыццё і прыгоды Мішкі Япончыка» (Украіна). 1-я серыя.
**10.10** Серыял «Знахар» (Расія). 2-я серыя.
**11.05** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон-2» (Украіна - Расія). 2-я серыя.
**12.10** Зямельнае пытанне.
**12.35** «Лістапад-2011». Дзённік.
**12.50** Драматычны серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША). 2-я серыя.
**13.50** «Здароўе». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Агарафобія». Адмысловы рэпартаж.
**15.40** Зона камфорту.
**16.10** Мастацка-публіцыстычны фільм «Эпоха. Падзеі і людзі».
**16.55** Серыял «Знахар» (Расія). 3-я серыя.
**17.55** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон-2» (Украіна-Расія). 3 -я серыя.
**18.45, 00.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Жыццё і прыгоды Мішкі Япончыка» (Украіна). 2-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.45, 00.55** Дзень спорту.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Драматычны серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША). 3-я серыя.
**23.15** «Лістапад-2011». Дзённік.
**23.30** Гістарычны серыял «Дасведчаная крыніца ў Маскве» (Расія). 3-я серыя.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Чорныя ваўкі». Шматсер. фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Справа гастранома №1». Шматсерыйны фільм. Заключныя серыі.
**23.20** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.50** «Зваротны адлік».
**00.20** «След».
**01.40** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінштчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** Фільм «Кіроўца для Веры». Расія - Украіна, 2004 г.
**10.40** «Зорныя гісторыі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Хірамант 2». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**16.50** «Пяць гісторый».
**17.20** «Мінштчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Начны прадавец». Расія, 2004 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Праўда».
**23.35** «Аўтапанарама».
**23.55** «Хірамант 2». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Дэтэктыў «Гульня па-сур'ёзнаму» (Расія-Украіна).
**11.05** Канцэрт «U2. 360. At The Rose Bowl».
**12.50** Рэальны свет.
**13.25** Страсці па культуры.
**14.10** «Каена: Вяшчунства». Фантастычны анімацыйны баявік (Францыя - Канада).
**15.40** Жаночая ліга.
**16.40** Дэтэктыў «Ілюзія палявання» («Беларусьфільм»). 3-я серыя.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Хакей. Кубак Палесся. Беларусь - Славенія. Прамая трансляцыя.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.35** Дэтэктыў «Ілюзія палявання» («Беларусьфільм»). 3-я серыя.
**23.40** Час футболу.
**00.25** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі–3».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі-3».
**23.25** Тэлесерыял «Ліквідацыя».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** «Выбары 2011. Дэбаты».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Таямнічая Расія».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.25** Дэтэктыўны серыял «Пятніцкі».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Серыял «Сталіца граху».
**01.10** Серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** Конны спорт. Часопіс.
**10.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны. 1/8 фіналу.
**11.15** Футбол. Эўра-2012. Швейцарыя - Чарнагорыя. Агляд.
**12.00** Футбол. Эўра-2012. Агляд матчаў.
**13.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны. 1/8 фіналу.
**14.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 69 кг. Парыж (Францыя).
**15.00** Live. Шары. Адчынены чэмпіянат Шатландыі. Перт (Шатландыя). Дзень 6-ы.
**17.30** Live. Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 77 кг. Парыж (Францыя).
**19.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 69 кг. Парыж (Францыя).
**20.00** Live. Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 75 кг. Парыж (Францыя).
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**23.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**00.00** Покер. Агляд.
У той жа час Вольга, якой паведамілі пра смерць мужа, адбіваючыся ад ўхажора, ідзе на фронт. Муж і жонка паасобку ўдзельнічаюць у славутай Бітве пад Варшавай, і сустракаюцца ў шпіталі, куды прывозяць параненага Яна. Хэпі-энд. Застаецца сказаць, што асабісты раман Яна і Вольгі паказаны ў кантэксце гісторыі. Перыядычна на экране ўзнікаюць Ленін, Пілсудскі, Сталін і г.д.

Менавіта ў тым, што Гофман паспрабаваў мадэрнізаваць Сянкевіча, бачыцца прычына правалу фільму. «Газета Выборча» ўзгадвае, з якім энтузіязмам успрымалі працы Гофмана ў 1970-я, калі ён займаўся экранізацыяй трылогіі Сянкевіча. Тады нават праводзіліся кампаніі накшталт таго, хто мае права выконваць якую ролю. Дадатковым фактарам была актуальная ў той час тэма незалежнасці і пагрозы знешняй акупацыі, якая ўвесь час гучыць у творах Сянкевіча. У цяперашняй Польшчы патрыятычныя фільмы аказаліся анахранізмам.

Кансерватыўная газета «Рэч Паспалітая» знайшла выйсце з сітуацыі. Яна заклікае не намагацца глядзець на карціну вачыма гісторыка ці кіназнаўцы. Тады стужка сапраўды пачынае бавіць, захапляе, калі яе сур'ёзна не трактаваць. А «сур'ёзнай трактоўкі фільм не заслугоўвае».

Затое ў нас пра карціну будуць разважаць. Фільм быў паказаны ў СНД толькі адзін раз (22 кастрычніка ў Кіеве ў рамках фестывалю «Молодість»), аднак шуму ўжо нарабіў.

У тым ліку з-за новага падыходу да гісторыі. Гофман упершыню ў польскім масавым кіно паспрабаваў прадставіць вайну 1920 года не як польска-бальшавіцкае змаганне, а як мінімум сумесную вайну палякаў і ўкраінцаў супраць чырвоных. Фрагментарна першым дапамагаюць яшчэ і белыя. Недзе на заднім фоне агучваецца і беларуская праблема.

З самага пачатку Пілсудскі на экране агучвае свой федэральны праект — стварэнне незалежнай Украіны і Беларусі як дзяржаў — саюзніц Польшчы. На экране можна пабачыць Пятлюру і яго войска. Сам Пілсудскі кажа, што мэтай яго паходу на Кіеў з'яўляецца вяртанне гораду ўкраінцам.

Што тычыцца беларускай тэматыкі, то яна зводзіцца да эпізоду з дзяўчынай з нейкай беларускай вёскі. Тая мела глупства накарміць-напаіць чырвоных, якія адразу пасля трапезы палезлі яе гвалціць. Крыніцкі як сапраўдны шляхціц абараняе нашу суайчынніцу, якая відавочна ўвасабляе ўвесь край.

Калі меркаваць па рэакцыі на прэм'еру ў Кіеве, украінскае грамадства аказалася не гатовае да такога падыходу. Магчыма таму, што ў нацыянальнай свядомасці засталася траўма ад Рыжскага міру (маецца на ўвазе падзел Украіны паміж бальшавікамі і палякамі, якія вялі перамовы ў Рызе сепаратна ад сваіх саюзнікаў украінцаў). Магчыма, таму фраза Пілсудскага на экране пра тое, што ён верне Кіеў украінцам, выклікала падчас прэм'еры смех у гледачоў.

Не спадабаўся гледачам і вобраз украінца-тубыльца, якому дапамагаюць добрыя паны. Як напісаў адзін з крытыкаў, такі ўкраінец занадта падобны на тыпаж украінца ў савецкіх стужках. З той розніцай, што там яму працягваў руку дапамогі старэйшы брат.

Блізкае да Партыі рэгіёнаў выданне піша: «У «Бітве за Варшаву» Гофмана мы маем справу зусім не з гістарычна дакладнымі падзеямі і не з мастацкай вобразнасцю, а з прапагандысцкім лубком, які наўмысна вульгарызуе і нават фальсіфікуе гісторыю. І хай візуальна «гісторыя» пададзена ў 3D, у сэнсе праўдзівасці на 1D не наскрэбці сэнсавай аб'ёмнасці і аб'ектыўнасці ў бачанні гісторыі XX стагоддзя».

На самай справе ўспрыняць Гофмана ўсур'ёз перашкаджае карыкатурнасць персанажаў. Камісар Быкоўскі (ён шмат у чым нагадвае Дзяржынскага) гіперсадыст з самага чэкісцкага пекла. Матывы вайны з Польшчай ён тлумачыць сваім салдатам вельмі проста: «У Варшаве шакалад ляжыць на вуліцах! Багатыя крамы! Золата! Футры!.. Усё гэта будзе ваша! Даеш Варшаву!»

Рэжа вока палітычная кан'юнктура. У самы разгар «Бітвы за Варшаву» на экране з'яўляюцца нейкія саюзныя Польшчы «амерыканскія авіядобраахвотнікі», якія вядуць з аэрапланаў бамбардзіроўку чырвоных кавалерыстаў.

У гэтым плане тэма агульнай барацьбы народаў старой Рэчы Паспалітай супраць бальшавікоў набывае прысмак штучнасці, палітычнай карэктнасці. Тым больш, што Гофман сам бярэ ў бальшавікоў іх мастацкія сродкі.

Думаецца, час пакажа, наколькі такія версіі вайны 1920 года ў масавай культуры дапаможа польска-ўкраінскай і польска-беларускай кааперацыі. Так што фільм Гофмана ўсё ж заслугоўвае сур'ёзнай трактоўкі.



ПАПУЛЯРНАСЦЬ

# НОВАЯ ЭВІТА

Алег НОВІКАЎ

**Крысціна Кіршнер трыумфальна пераабраная на пасаду прэзідэнта Аргенціны. Такой папулярнасці, як у яе, не меў ніводны палітык з часоў Эвіты Перон. Палітолагі кажуць пра нараджэнне новага сацыяльна-палітычнага руху — «крысцінізму» — і спрачаюцца пра яго будучыню.**



58-гадовая Крысціна Кіршнер (яе таксама завуць CFK) на выбарах атрымала 54 працэнта галасоў. Такім чынам, яна стала першай аргентынскай жанчынай, якая пераабраная на прэзідэнцкую пасаду. З улікам таго, што яе муж-нябожчык быў папярэднім гарантам. Кіршнеры ў агульным заліку будуць кіраваць краінай 12 гадоў.

Наогул, Крысціна ўсталявала ў дзень выбараў цэлую серыю рэкордаў. У гісторыі прэзідэнцкіх аргентынскіх выбараў ніводны кандыдат не атрымліваў у першым туры такой колькасці галасоў. Ніколі раней разрыў паміж лідарам і наступным кандыдатам не складаў такую вялікую дыстанцыю. CFK адарвалася ад сацыяліста Гермеса Бінэра, які заняў другое месца, на цэлых 35 працэнтаў.

Гэта яшчэ не ўсё. За час кампаніі яна не дала ніводнага інтэрв'ю, ніводнай прэс-канферэнцыі, каб яе не абвінавацілі ў выкарыстанні адміністратыўнага рэсурсу.

На тое, каб лічыцца галоўнымі спадкаемцамі Хуана і Эвіты Перонаў на выбарах прэтэндавалі тры кандыдата. Увогуле ў краіне дзейнічае каля пяці перанісцкіх партый. Аднак усе, акрамя Крысціны, аказаліся маргіналамі

І гэта таксама не ўсё. Фронт для перамогі (FPV) — прапрэзідэнцкая партыя — пасля выбараў кантралюе абедзве палаты і тэарэтычна можа лёгка праводзіць любыя законы. У 8 з 9 правінцый, якія выбіралі губернатара, верх узялі таксама прадстаўнікі FPV. Палітычная картаграфія Аргенціны цяпер выглядае так: 20 з 24 правінцыйных губернатараў — сябры FPV.

Як пішуць эксперты, у Аргенціне склалася дзіўная сітуацыя. Крысціна дамаглася такога ж аб'ёму ўлады і ступені народнай падтрымкі, як той жа левы папуліст Уга Чавес. Аднак апошні, каб атрымаць такі маштаб папулярнасці, актыўна выкарыстоўвае папулісцкую рыторыку, гуляе на антыамерыканскіх настроях, нацыяналізуе прыватныя прадпрыемствы, запускае маштабныя сацыяльныя праграмы, зачыняе апазіцыйныя СМІ. У Крысціны ўсё не так, аднак усе галасуюць за яе.

Чыннікі трыумфу CFK, безумоўна, шмат у чым тлумачацца фактарам часу. Пасля шматлікіх гадоў эканамічнага спаду Аргенціна нечакана стала адным з сусветных лідараў па росту ВУП. Эканамічны рост летась склаў 10 працэнтаў (вышэй у свеце толькі ў Індыі і Кітая). Гэта дазволіла падняць пенсіі і мінімальную заробітную плату, вывесці частку бізнэсу з шэрага сектара, датаваць спажыўцоў, інвеставаць грошы ў будаўніцтва сацыяльнага жылля. Ва ўмовах глабальнай рэцэсіі, аргенцінцы хацелі б прынамсі законсерваваць някепскі стан рэчаў. Тым больш, што ў іх перад вачамі закранутыя крызісам Чылі і Бразілія.

Свой унёсак у перамогу мадам Кіршнер дадала і ідэйная фізіяномія апазіцыі. Гістарычна супернікі пераністаў, да якіх адносяць партыю Крысціны Кіршнер, групуюцца вакол ліберальнай партыі Грамадзянскі радыкальны саюз (UCR). Лібералізм ва ўмовах крызісу апынуўся пазбаўленым усякай прывабнасці. Паказальна, што Рыкарда Альфансін, кандыдат UCR, нават не заняў другое месца. За яго аддалі галасы толькі 11 працэнтаў.

Крысціне дапамаглі асаблівасці руху перанізму, які звязаны з вобразам жанчыны, Эвіты Перон, культ якой дасюль пануе ў шматлікіх простых сем'ях. Крысціна актыўна інвеставала ў падтрымку грамадскага інтарэсу да Эвіты яўна з разлікам на тое, каб стаць у вачах выбаршчыкаў яе пераінкарнацыяй. Гэта ёй цалкам удалося. У дзень выбараў па Буэнас-Айрэсе хадзілі натоўпы і скандавалі перанісцкія лозунгі.

Дзякуючы манаполіі на Эвіту, Крысціна падарвала пазіцыі іншых фракцый перанісцкага руху. Нагадаем, што сучасны перанізм — гэта вельмі каляровы рух. На тое, каб лічыцца галоўнымі спадкаемцамі Хуана і Эвіты Перонаў на выбарах прэтэндавалі тры кандыдата. Увогуле ў краіне дзейнічае каля пяці перанісцкіх партый. Аднак усе, акрамя Крысціны, аказаліся маргіналамі. Іншыя перанісцкія кандыдаты атрымалі 5–6 працэнтаў.

Аднак і без таго вакол прэзідэнта склаўся культ асобы. «Fuerza Argentina — Fuerza Cristina!» (Моц Аргенціны — Моц Крысціны!) — лозунг кампаніі Кіршнер.

І ўсё ж галоўным джокерам Крысціны была яе эканамічная палітыка, якая будуецца на прынцыпах пратэкцыянізму і адначасовай падтрымкі росту ўнутранага попыту праз актыўны ўдзел дзяржавы ў эканоміцы. Пасля таго, як напрыканцы нулявых гадоў краіна пачала выходзіць з крызісу, інтарэс да такога курсу заўважна скараціўся. Два гады таму прыхільнік Кіршнер прайгралі выбары ў парламент. Але ў час крызісу большасць аргенцінцаў зноў аказалася гатовай падтрымаць левыя рэцэпты ў эканоміцы.

Агульны кансенсус на карысць антыліберальных мадэляў эканомікі дазволіў Крысціне тактычна манеўраваць, шукаць сутыкненні інтарэсаў розных сектараў грамадства. Напрыклад, буйны бізнэс зацікаўлены ў далейшым развіцці нацыянальных дзяржаўных праграм накшталт выпуску таннага электрычнага аўтамабіля AIPA, які павінен збірацца выключна з аргентынскіх кампанентаў. Будаўнічыя кампаніі хацелі б працягу рэалізацыі жыллёвай праграмы, што ў сваю чаргу падтрымлівае гарадскі сярэдні клас і працоўныя. Сельскай правінцыі падабаюцца субсідыі для вытворцаў мясцовых прадуктаў — яшчэ адна фішка Кіршнер.

CFK атрымалася кансалідаваць нацыю дзякуючы шэрагу фактараў: эканамічны рост апошніх часоў звязаны з актыўнай роляй дзяржавы, ідэйная неадэкватнасць ліберальнай апазіцыі ва ўмовах крызісу, адсутнасць іншай левай альтэрнатывы, перанісцкая традыцыя.

Нягледзячы на кастрычніцкі трыумф, будучыня «крысцінізму» пад вялікім пытаннем. Падчас крызісу перад яе ўрадам аўтаматычна паўстаюць новыя арыенціры: не дапусціць адтоку з краіны капіталу, узяць пад кантроль міжнародны гандаль, распрацаваць мадэль пошуку вонкавых крэдытаў, стварыць новую энергетычную сістэму, развіваць інфраструктуру, каб падтрымліваць высокі ўзровень занятасці насельніцтва.

Не факт, што дастаткова ліберальныя бароны FPV і частка прадпрымальнікаў пагодзяцца пайсці на падобныя крокі. З іншага боку — сеньёра Кіршнер, маючы такі вялікі рэйтынг, можа пайсці ва-банк — разарваць з правымі пераністамі. Аднак левыя аналітыкі пакуль што не вераць у тое, што Крысціна Кіршнер пойдзе так далёка. «Усё ж яна не Эвіта», — сцвярджае мексіканская газета «Jornada».

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ВІКТАР ЯНУКОВІЧ



Па ўсёй краіне ходзяць чуткі, што Віктар Фёдаравіч рыхтуе татальныя фальсіфікацыі прызначаных на восень наступнага года выбары ў парламент. У якасці доказу крытыкі бела-блакітных (колеры Партыі рэгіёнаў) згадваюць незвычайныя працэсы на валютным рынку. Апошнім часам урад пастанавіў, каб набыццё або продаж валюты адбываліся выключна з прад'яўленнем пашпарту. Пры гэтым устаноўленая працэдура трансакцыі патрабуе, каб з першай старонкі пасведчання была знятая копія, а кліенту выдадзена адмысловая квітанцыя. Афіцыйная матывацыя рашэння — неабходнасць кантраляваць сектар малых бізнесменаў, якія быццам імпартуюць у краіну шмат тавараў і не плацяць падаткаў. Аднак грамадства не паверыла ўладам. Па-першае, абыйсці закон вельмі лёгка: заўсёды хапае гатовых за грошы пазычыць пашпарт. Калі верыць газеце «Сегодня», у Кіеве ўжо ўзнікла прафесійная гільдыя тых, хто гатовы набыць (здаць) валюту для іншай асобы. Такса — 10 працэнтаў з аперацыі. Адпаведна, існуе думка, што Януковіч папросту збірае пашпартныя дадзеныя для таго, каб арганізаваць глабальнае ўкідванне выбарчых бюлетэняў на наступных выбарах. Цяперашні рэйтынг прэзідэнта Украіны балансуе на мяжы 15–18 працэнтаў.

### ЛІНДЗІВЕ МАЗІБУКА



Дэпутат парламенту Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі, чарнаскурая жанчына, якой нядаўна споўніўся 31 год, узначаліла ў нацыянальным парламенце фракцыю Дэмакратычнага альянсу (DA). Гэта самая буйная партыя белай апазіцыі ў краіне. Такі выбар адназначна сведчыць пра намер Дэмакратычнага альянсу пазбавіцца іміджу выключна партыі белых паўднёвых афрыканцаў і прыцягнуць галасы чарнаскурых выбаршчыкаў, якія традыцыйна галасуюць за партыю Афрыканскі нацыянальны кангрэс. Для даведкі: DA, які атрымаў на апошніх выбарах 17 працэнтаў галасоў, у масавай свядомасці працягвае заставацца партыяй белых лібералаў, якія хаця і крытыкавалі ў свой час рэжым апартэіду, лічацца пераважна партыяй Капскай правінцыі. Капская правінцыя — рэгіён ПАР, дзе самы вялікі працэнт людзей з белай скурай. Кангрэс, здаецца, адчувае ў дзяўчыне пагрозу. Інакш бы яго лідары не абвінавацілі Ліндзіве ў тым, што яна гаворыць не як афрыканка, а «па-беламу».

### ЯНУШ ПАЛІКОТ

Нядаўні электаральны сюрпрыз Палікота (яго партыя здолела ўвайсці ў Сейм) выклікаў шмат спекуляцый вакол будучыні Руху Палікота. Найбольш далёка ў гэтай галіне зайшоў Ежы Урбан, выдавец скандальнага штодзённіка «Nie!». Урбан усур'ёз лічыць, што ў Палікота добрыя шансы на тое, каб праз 10 гадоў стаць прэзідэнтам краіны. Заява выклікала шмат іранічных каментароў. Вельмі аўтарытэтны палітолаг Януш Чапіньскі на старонках салідных і ў дадатак не прапалікотаўскай «Газеты Выборчай» падзяляе ўрбанаўскі прагноз. Ён спасылаецца на тое, што менавіта Палікот стаў нефармальным лідарам польскай антыклерыкальнай левай і правадыром моладзі, якая пачынае навязваць грамадству сваю павестку дня. Чапіньскі спасылаецца на сацыялагічныя даследаванні, якія кажуць пра заўважнае падзенне колькасці вернікаў у краіне (на пачатку 1990-х у Касцёл не хадзіла толькі 13 працэнтаў палякаў, а сёння ўжо 33). Праз 10 гадоў іх стане больш за палову, і Палікот як іх гістарычны лідар атрымае шанс сапраўды стаць прэзідэнтам.



НАТАТКІ

# НІРВАНА БЕЛАРУСА

## БУДНІ БЕЛАРУСКАГА САНАТОРЫЯ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ



**«Як у санаторыі!» — шчасліва пацягваўся дзядзька Грыша, развальваючыся на пасцілцы. Перад намі стаяў трохлітровы слоік са свежым малаком, ляжалі пакроены шматок сала, зялёныя пёркі цыбулі і «цаглінка» хлебу — такі зазвычай завозяць у беларускія сельпо, і сяляне выстройваюцца па яго ў даўгія чэргі. Побач з намі сохла толькі што паварушанае сена, пад якім споўдалі мышкі-палёўкі, а часам у кірунку найбліжэйшага балота дзелавіта прапаўзалі гадзюкі. Дзядзька Грыша ляжаў роўна дзве гадзіны — да пары, пакуль сена не трэба было пачынаць зграбаць у стажкі. І гэта былі самыя залатыя гадзіны дня, а можа быць, і ўсяго лета.**

Каб зразумець, пра што гэта дзядзька Грыша, давялося дажыць амаль да яго тагачаснага веку і атрымаць пуцёўку ў Самы Сапраўдны Беларускі Санаторый.

### Маскоўскі вырай

Беларускі санаторна-курортны фонд — расійскі вырай. Гэта, здаецца, не навіна і не сакрэт. Паводле газеты «Камсамольская праўда», у 2010 годзе беларускія санаторыі наведалі 98 тысяч расіянаў. І толькі трапіўшы ў гушчу тэмы, разумееш, наколькі не перабольшаная гэтая лічба. У санаторый «Лясныя азёры» няпроста дабрацца з Мінску — расклад адзінага аўтобуса прыстасаваны пад патрэбы ўшацкіх студэнтаў, якія навучаюцца ў сталіцы. Затое курсіруе спецыяльны санаторны бусік на аўтавакзал ва Ушачы, адкуль адпачывальнікаў аператыўна давозяць на піцерскія і маскоўскія цягнікі ў Віцебск і Полацк. «І гэта яшчэ не сезон, — каментуе сітуацыю суседка па століку, аматарка санаторнага лячэння па лініі прафсаюзаў, — здабыць пуцёўку на лета беларусу амаль немагчыма»...

Расіяне, як і любыя замежнікі, плацяць у беларускім санаторыі ўдвая, а то і ўтрая больш за грамадзян Беларусі. Паводле іх сведчанняў — у сярэднім 20 тысяч расійскіх рублёў з чалавека. І гэта, паводле іх словаў, удвая-ўтрая танней, чым паездка ў любы з санаторыяў Расіі. Як сцвярджае мой малгёўскі сябар, які нядаўна перасякаў усходнюю мяжу РБ, «палова жыхароў Пскоўскай вобласці або толькі што вярнулася з беларускага санаторыя, або збіраецца ехаць туды вось проста цяпер».

Параўнальна нізкія кошты, ветлівы прыём і сапраўднае малако — вось тры кіты, на якіх трымаецца санаторны бізнэс Беларусі. На першы сняданак пасля заезду госці з Расіі масава замаўляюць сабе паліты смятанай тваражок. Гэта амаль рытуал.

Цэнтральны праменад санаторыя ў абедзенны час ператвараецца ў кірмаш — сюды звозяць вясковыя прысмакі, касметыку і кітайскія сувеніры з усёй ваколіцы. Ушачы — адміністратыўны цэнтр раёну, ні разу не памежнага з Расіяй. У дзяржаўным (!) універмагу ў пакупнікоў пытаюцца: «Якімі рублямі будзеце расплачвацца?» «Хозяйка, купи!» — сутаргава чапляецца ў рукаво гандлярка на рынку ва Ушачах. Каб вокамгненна адпусціла, варта проста адказаць па-беларуску.

На самым буйным партале, прысвечаным санаторна-курортнаму турызму Беларусі, — sanatorii.by — зарэгістравана 103 санаторыя. І ўсе яны, у той ці іншай ступені, выжываюць і нават квітнеюць за кошт расійскага капіталу. Чэшскае міністэрства культуры і турызму ў 2005 годзе выдаткавала вялікія грошы, каб перамагчы сусветны стэрэатып Чэхіі як краіны, дзе можна ў неабмежаваных колькасцях напівацца танным півам і легальным абсэнтам (прычым пажадана ўперамешку). Чэхі абралі сваім дэвізам на пяцігодку да 2010 года словы «klid a pohoda» («цішыня і спакой»). Беларускі дэвіз мог бы гучаць як «смятана, тваражок і душ Шарко».

**Беларускі санаторый — гэта кароткатэрміновы выхад у астрал у разгар цяжкой працы. Санаторый — нірвана беларуса. Санаторый — гэта баракамера сацыяльна арыентаванай дзяржавы**

### Душа санаторыя

У кожным таварыстве вы знойдзеце таго, каго можна назваць «душой кампаніі». Адпачывальнікі ў санаторыі — выпадковая супольнасць, на фоне якой непазбежна вылучаецца пэўны тып людзей, якіх можна назваць «душой санаторыя». Гэта зазвычай мужчыны ў веку ад 40 да 60-ці, тыя самыя, якія могуць без дазволу зазірнуць у масажны кабінет і таямніча прамовіць: «Алачка, як і дамаўляліся, а чацвёртай у альтанцы за трэцім корпусам!..» А чацвёртай у альтанцы за трэцім корпусам збіраецца невялічкі натоўп, які шыхтуецца цугам і з пакункамі ў руках сыходзіць у найбліжэйшы лес, ачолены ўсё тым жа мужчынам. Праз гадзіну з гушчару ўжо даносіцца смех жанчын і дымок шашлыку.

Каб мы не памыліліся адносна іх сацыяльнай місіі, такія мужчыны абазначаюць сябе, проста як падарожнікі флікерамі, уніформай, ролю якой у амаль абавязковым парадку грае спартовы гарнітур незвычайнага колеру. Падчас майго перабывання ў санаторыі былі зафіксаваныя морквава-аранжавы, ярка-блакітны, насычана-чырвоны і снежна-белы варыянты санаторных спецгарнітураў. Абавязковыя атрыбуты «душы санаторыя» — бейсболка і модныя красоўкі. Важна, каб яны пасавалі да ўсяго гарнітура (на мове мужчын гэта азначае адзіную марку фірмы спортадзення па ўсім целе).

Вечарам душа санаторыя бегае ўздоўж карпусоў і крычыць: «На возера! Усе на возера!» Або: «Дамы, я лячу за шампа-а-анскім!» Зранку душа санаторыя вохае на ўвесь лечкорпус і гучна наракае на здароўе ў чарзе па працэдуры: выяўляецца, што гарэліцу ўчора запівалі гаючай вадой з мінеральнай крынічкі, а Алачка махнула келіхам шампанскага ў цеснаватым пакоі трэцяга корпусу і расквасіла кінескоп тэлевізара «Віцязь» — на кампенсацыю шкоды накіраваная сюды адным з беларускіх прафсаюзаў душа санаторыя аддасць усе адпачынкавыя грошы...

...Без гэтых яркіх агеньчыкаў на прысадзе санаторнага праменаду ў лясным санаторыі было б нудотна. Я амаль упэўненая, што дзядзька Грыша ў свой час быў выдатнай душой санаторыя.

### Старажытны курорт

Санаторый для мяне заўсёды асацыяваўся з дабрабытам савецкай імперыі, з маладосцю маёй бабулі, з ранніім дзяцінствам, калі дома цэлы месяц не было мамы або таты. Прыгожая сацыялістычная казка пра палац Радзівілаў, адабраны ўладамі савецкага Нясвіжу ў узурпатараў і перададзены працоўнаму класу, каб кожны просты беларус меў права адпачыць і «паправі́ць здароўе» (з вуснаў «душаў санаторыя» гэтыя народны штамп гучыць асабліва цынічна). Гэта групавыя фотаздымкі людзей у пацешных драпавых паліто на фоне раскошнага класіцызму і з надпісам: «Ялта. Февраль 1952»... І тым большым было маё здзіўленне, калі звычка чытаць шыльды ў калідорах паліклінік паставіла мяне перад вялікім шчытом «Гісторыя санаторыя «Лясныя азёры».

Мінеральныя воды возера Малая Баркоўшчына былі пазначаныя на швейцарскіх мапах ужо ў 1502 годзе, а ў пачатку XVIII стагоддзя тут ужо дакладна адбывалася лячэнне. У XIX стагоддзі тут дзейнічаў шырока вядомы на абшарах былой Рэчы Паспалітай двух народаў ды Расійскай Імперыі курорт, дзе, напрыклад, у 1860 годзе «папраўлялі здароўе» каля 300 чалавек. Некаторыя жылі ў драўляным гатэльчыку, збудаванаму вакол купальнаў на 32 ванны (вада падавалася з крыніцаў па дубовых трубах і награвалася). Тыя, каму бракавала месца ў гатэльчыку, спыняліся ў вёсцы, якая, трэба думаць, ужо тады навучылася зарабляць на багатых гасцях з Варшавы і Франкфурту, Масквы і Пецярбургу.

На двух азёрах бруяла чатыры крыніцы — дзве з сернай вадой, а дзве з жалезістай. Галоўны профіль баркоўшчынскай гаючай вады — хваробы апорна-рухальнага апарату: параліч, рэўматызм. І таму тут густа адбываліся ўсе гэтыя эфектныя гісторыі пра хворых, якіх прывозілі на насілках, а сыходзілі яны ўжо сваімі нагамі... Таксама тут лячылі ад залатухі, няплоднасці, эпілепсіі.

У 1919 годзе ў Баркоўшчыне адчыніўся першы беларускі санаторый, які праіснаваў да Вялікай айчыннай вайны. Цікавасць выклікае факт, што «ў 1941 годзе фашысты захапілі санаторый і цэлы год скарыстоўвалі яго па прамым прызначэнні». «Ну так — лячылі тут ад ран сваіх салдатаў і афіцэраў», — задуменна пацвярджае даведкавую інфармацыю маладая масажыстка, ды так, нібыта была сведкай падзеяў. Паколькі ў познія гады вайны Ушаччына была фактычна партызанскай рэспублікай, доўга немцы не лячыліся — прайгралі беларускім партызанам бітву за джакузі і пры адступленні санаторый спалілі. Аднавіць працу ён змог ужо толькі ў 1961 годзе.

А з канца 1990-х пачынаецца ўжо зусім сучасная гісторыя санаторыя «Лясныя азёры» — з СПА і салямі Мёртвага мора, але апісанне ўсіх гэтых вабнотаў я пакіну калегам з парталу sanatorii.by. Галоўнае, інфармацыя з шыльды цалкам пацвярджаецца, калі спускаешся з высокага берагу да возера Доўжына. Як і пяць стагоддзяў таму, лясныя азёры Ушаччыны агаломшваюць сваёй тэрапеўтычнай прыгажосцю.

### Выхад у астрал

Такім чынам, рэспектабельныя расійскія пажылыя пары, самотныя беларускія ваўкі ды ваўчыцы па накіраванні прафсаюзаў — і паміж імі я, цалкам выпадкова. «Девочки, это деревня, и поэтому развлечений там нет вообще никаких!!!» — гэты водгук у інтэрнэце быў найлепшай рэкамендацыяй для чалавека, які зарабляе на жыццё анонсамі, правядзеннем і апісаннем культурных мерапрыемстваў. І ў выніку я няблага адпачыла ад усяго гэтага і «паправі́ла здароўе» — хоць ні разу не схадзіла ў лес разам з Алачкай і іншымі. Але галоўнае, я канчаткова зразумела, пра што вялося дзядзьку Грышу.

Беларускі санаторый — гэта кароткатэрміновы выхад у астрал у разгар цяжкой працы. Санаторый — нірвана беларуса. Санаторый — гэта баракамера сацыяльна арыентаванай дзяржавы, увасабленне мары накшталт вядомага гогалеўскага «каб галушкі самі ў рот заскоквалі». Санаторыі — гэта не проста гаючыя гразі або дыетычнае харчаванне на аснове «сапраўднага малака». Санаторый — гэта месца, дзе за цябе ўсё вырашылі іншыя — дактары, медсёстры, кухары на кухні. У санаторыі тваё жыццё рэгламентаванае, прадуманае, а таму бестурботнае. Тваражок, смятана, душ Шарко і тэлевізар «Віцязь». І твой адзіны клопат — не зачапіць гэты тэлевізар келіхам ад шампанскага, і тады ты будзеш мець сілы і імпэт з чыстым сумленнем заступіць на новую працоўную змену.

СПАДЧЫНА

# БЕЛАРУСКІ ГОРАД КАЗІМІР

Лявон ЦЕЛЕШ

**З выдатным беларускім археолагам, доктарам гістарычных навук, прафесарам Сяргеем Рассадзіным шчаслівы лёс звёў мяне сёлета, калі ён з групай студэнтаў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі вёў археалагічныя даследаванні на тэрыторыі старажытнага Лаўрышаўскага манастыра. Нядаўна Сяргей Рассадзін запрасіў мяне на раскопкі старажытнага беларускага горада Казіміра, які існаваў больш за 350 гадоў таму на тэрыторыі сённяшняга Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці.**



Герб г. Казіміра

Зараз на гэтым месцы размяшчаецца вёска Каралеўская Слабада. Цёплай вераснёўскай раніцай мы ў камфартабельным аўтобусе прыбылі на месца археалагічных раскопак. Навучэнцы Светлагорскага індустрыяльнага каледжа пад кіраўніцтвам свайго выкладчыка, вялікага аматара археалогіі Генадзя Рызнавокага пачалі раскопкі на месцы верагоднага гандлёвага пляца старажытнага горада. А мы тым часам прайшліся па мясцінах, дзе існаваў горад.

Сяргей распавёў мне шмат цікавага аб трагічнай гісторыі горада, аб выніках археалагічных даследаванняў, якія ён тут праводзіць ужо больш за 5 гадоў. Прыярытэт у адкрыцці месцазнаходжання горада Казіміра належыць менавіта Сяргею Рассадзіну, хаця і да яго «тэарэтычна» гісторыкам было вядома, што існаваў старажытны горад, але ў дакументах ён быў абазначаны недзе паміж гарадамі Бабруйск і Рагачоў.

А гісторыя адкрыцця Рассадзіным горада пачалася з 2001 года, калі ён быў запрошаны ў Варшаву для выступу з дакладам. У свой вольны час вучоны наведаў Галоўны архіў старажытных актаў, дзе зберагаліся дакументы аб тэрыторыі сучаснай Беларусі. У Нясвіжскім архіве Радзівілаў Сяргей Рассадзін натрапіў на цікавы дакумент — грамату, напісаную ў 1643 годзе ад імя каралевы Рэчы Паспалітай Цэцыліі Рэнаты. У ёй гаварылася аб «прывілеі гораду Казіміру ў старостве Бабруйскім». Сяргей Рассадзін гаворыць, што ніхто з гісторыкаў не ведаў да таго часу ніякага горада Казіміра на рацэ Бярэзіне ў старостве Бабруйскім. Пачаліся навуковыя пошукі. І выявілася наступнае.

У 1637 годзе кароль Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV Ваза ўзяў шлюб з дачкой аўстрыйскага імператара Фердынанда II Цэцыліяй Рэнатай Габсбург. І ўжо праз два гады існаваўшае тады Бабруйскае староства перайшло ва ўладанне польскай каралевы і вялікай княгіні ВКЛ. Цэцылія Рэната вырашыла стварыць тут тэрыторыю, спрыяльную для развіцця гандлю і рамёстваў, гаворачы сучаснай мовай — свабодную эканамічную зону.

У XVII стагоддзі месца такой тэрыторыі называлі слабадой, а паколькі Цэцылія Рэната была каралевай, дык і паселішча на беразе ракі Бярэзіны назвала Каралеўскай Слабадой. Гэта быў папярэднік горада Казіміра. Каралева марыла стварыць на гэтым месцы квітнеючы горад, сталіцу староства. А паколькі Каралеўская Слабада развівалася паспяхова, дык у хуткім часе атрымала гарадскія правы.

Па мерках тых часоў, гэта быў буйны горад: уздоўж крутога берага Бярэзіны ён прасціраўся амаль на паўтара кіламетра, а ўглыб — на кіламетр. У каралевы ў 1640 годзе нарадзіўся сын Жыгімонт Казімір, і Цэцылія Рэната вырашыла назваць горад яго імем — Казімір. Новаму гораду ў 1643 годзе было нададзена Магдэбургскае права. На гербе горада была выява залатога льва з мячом у лапе пад зоркай. Каля льва стаяў човен. Дагэтуль гербы з ільвамі на ўсёй Беларусі былі толькі ў Лідзе, Слоніме і Гарадку. А на Гомельшчыне наогул вядомы толькі чатыры гістарычныя гербы: Мазыра, Гомеля, Рэчыцы і Рагачова.

У Казіміры існавалі ратуша з гадзіннікам, прыстань, праводзіліся чатыры кірмашы на год. Квітнелі і шматлікія рамёствы: выплаўлялася шкло, выраблялася кафля, кваліфікаваныя майстры займаліся апрацоўкай металу. І сёння на гэтым месцы, магчыма, існаваў бы вялікі сучасны горад, калі б не вялікая бяда,



Фота аўтара

Навучэнцы каледжа на раскопках



Вяз — сведка даўніх падзей

якая абрынулася тады на ўсю Беларусь. Сын каралевы, Казімір, пражыў усяго 16 гадоў, а цудоўны горад паўтарыў яго лёс.

Казімір не паспеў замацавацца на мапах Еўропы. У 1654 годзе пачалася кровапралітная вайна на тэрыторыі Беларусі паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай, якая цягнулася доўгіх 14 гадоў. Расійскім царом Аляксеем было загадана свайму войску знішчыць насельніцтва нашага краю. «Касцёлам не быць, уніятам не быць, жыдам не быць», — такая была ўстанова цара. Вынікі вайны для ВКЛ былі трагічныя: насельніцтва нашай Радзімы скарацілася з амаль трох мільёнаў да 1,4 мільёна чалавек, былі разбураны і спалены амаль усе захопленыя гарады і вёскі.

Недзе напачатку 1655 года расійскімі войскамі пад кіраўніцтвам гетмана Івана Залатарэнкі быў знішчаны разам з жыхарамі і горад Казімір. Паважаны прафесар Сяргей Рассадзін выводзіць мяне на высокую пляцоўку, адкуль адкрываецца цудоўны далягляд на раку Бярэзіну і яе зарэчныя далі. Тут стаяла праваслаўная царква. У час раскопак пад месцам яе тагачаснага знаходжання было знойдзена шмат абгарэлых чалавечых костак, якія сведчылі, што жыхары горада былі загнаныя ў праваслаўны храм і спаленыя там разам з будынкам царквы.

У некаторых публікацыях горад Казімір называюць Беларускай Атлантыдай. Але легендарная Атлантыда знікла ў выніку прыродных катаклізмаў, а Казімір — у выніку разбуральнай вайны і чалавечай жорсткасці. Хатынь сярэднявечча — гэтая назва больш адпавядае рэчаіснасці. Магчыма, знойдуцца тыя, хто абвінаваціць аўтара гэтага артыкула ў распальванні варожасці паміж рускім і беларускім народамі. Але гэта ўсяго толькі канстатацыя гістарычных фактаў: дастаткова азнаёміцца з «Энцыклапедыяй гісторыі Беларусі» і іншымі гістарычнымі крыніцамі, а таксама з вынікамі археалагічных даследаванняў прафесара Сяргея Рассадзіна.

Продкі сучасных расіян таксама шмат пацярпелі ад мангола-татарскіх заваёўнікаў, ад крыжакоў і ад іншай навалачы. А з гісторыі вядома таксама, з якой азіяцкай жорсткасцю распраўляліся ўладары Маскоўскай дзяржавы са сваімі людзьмі, западозранымі ў нязначным непадпарадкаванні. Нам няма чаго дзяліць. Жорсткія былі часы сярэднявечча, калі і ў Вялікім Княстве Літоўскім, і ў Маскоўскай дзяржаве нават браты ішлі вайной адзін на аднаго. А зараз надышоў час збіраць камяні і распавесці людзям праўду аб мінулых часах.



Ля стэнда з экспанатамі загадчыца Светлагорскага музея Людміла Грабко

Непадалёку ад царквы стаяла гарадская ратуша. Сяргей Рассадзін гаворыць, што на гэтым месцы, у культурным слоі, быў знойдзены валун з выявай крыжа на ім, які быў, верагодна, у падмурку ратушы. Тут жа, на невялікай глыбіні, былі знойдзены чалавечыя шкілеты з рубленымі пашкоджаннямі. Дзеці, якія дапамагалі весці раскопкі, былі ў жаху. Нездарма перад пачаткам раскопак тут святарамі быў адслужаны малебен.

Вялікі, у тры чалавечых абхваты, вяз, які сустрэўся на нашым шляху, быў сведкам тых гістарычных падзей: яго ўзрост налічвае каля 400 гадоў. За час правядзення раскопак было знойдзена шмат цікавых прадметаў, якія маюць адносіны да XVII стагоддзя і пацвярджаюць знаходжанне ў гэтым месцы горада Казіміра. Гэта і фрагменты керамічнай кафлі, і кавалкі шкляных і фаянсавых вырабаў, і наканечнікі стрэл і арбалетаў. На наяўнасць горада ўказваюць і знойдзеныя манеты: у той час у сельскай мясцовасці грашыма не карысталіся, бо ў вёсках меў месца натуральны абмен. Вялікай нечаканасцю з'явілася знаходка бранзалеткі і прасніцы з шырокай адтулінай, рэчаў, характэрных для сярэдзіны I тысячагоддзя нашай эры. А знойдзеная крэмніевая ножападобная пласціна наогул адносіцца да бронзавага веку.

Шмат аб якіх каштоўных знаходках Сяргей Рассадзін умоўчвае, каб не навесці на след «чорных капальнікаў» з металашукальнікамі. А іх тут нямала аб'явілася. Многа цікавых рэчаў знаходзяць на сваіх агародах і мясцовыя жыхары. За час майго знаходжання навучэнцамі Светлагорскага каледжа быў зроблены раскоп плошчай 16 квадратных метраў. У культурным слоі магутнасцю 30–40 сантыметраў былі знойдзены каваныя цвікі, кавалкі керамікі, глінянага посуду, кавалкі кафлі, роўна абчасаныя з двух бакоў камяні і іншае.

Сяргею Рассадзіну пашанцавала на аднадумцаў. У сваіх археалагічных даследаваннях ён атрымлівае моцную падтрымку ад старшыні Светлагорскага райвыканкама Сяргея Максіменкі і яго намесніка Сяргея Мяркулава. Яны дапамагаюць як з тэхнікай, так і з забеспячэннем людзьмі. У раскопках прымалі ўдзел і мясцовыя вучні, і студэнты Мазырскага педагагічнага ўніверсітэта, і навучэнцы Светлагорскага каледжа. Напрыканцы нашай сустрэчы Сяргей прапанаваў мне наведаць Светлагорскі гісторыка-краязнаўчы музей, дзе выстаўлены для агляду наведвальнікаў больш за тысячу прадметаў, знойдзеных у час раскопак. Загадчыца музея Людміла Грабко з задавальненнем азнаёміла мяне з гэтымі экспанатамі.

Археалагічныя даследаванні будуць працягнутыя і ў далейшым і, безумоўна, прынясуць шмат новых знаходак і адкрыццяў. Добрую справу робіць выдатны вучоны і грамадзянін сваёй Радзімы Сяргей Рассадзін — даследчык гістарычнага мінулага шматпакутнай Беларусі.

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# ЯНЫ ВАС ЧАКАЮЦЬ!

**АЛЬБЕРТА — асоба з блакітнай крывёй.**



Коцік шыкоўнай блакітнай афарбоўкі, што падкрэслівае ягоныя прыгожыя зялёныя вочы, якія не могуць не запасці ў душу. Яго толькі нядаўна забралі ў прытулак «СуперКот» з пункту адлову на Гурскага, яшчэ не паспелі кастрыраваць і высветліць узрост. Але коцік вельмі стрэсуе і жадае хутчэй патрапіць дахаты!

У яго вельмі годны характар, добрыя манеры і іспыт «патрапіць у латочак» ён здае на выдатна!

Тэлефануйце — і ён абавязкова прамуркоча пра ўсе свае прыгоды на вуліцы і пра тое, як сумаваў увесь гэты час!

8-029 872 8032 Алена, 8-029 129 2073 Марыя, 8-029 199 9915 Юлія

**ПЭПІ — абрыкосавае калматае дзяўчо.**

Пэпі ўсяго толькі 8 месяцаў. Яна доўга бадзялася па вуліцах, галадала і кепска выглядала. Зараз яна памытая, пастрыжаная і апрацаваная ад паразітаў. Дзяўчынка вельмі любіць кудынебудзь забрацца: у кошык, на падваконне. Часам выконвае функцыі пыласмока. Пэпі любіць дзяцей і іншых жывёл.



Гэта маленькае (каля 30 сантыметраў у холцы) шчасце ўжо амаль прызвычаілася трываць да прагулак. І ўжо стэрылізаваная.

Тэлефануйце хутчэй — і цудоўны калмацік сагрэе ваша сэрца! 8-029 775 5753, Настасся

* * *

Усе гадаванцы — у падарунак. Болей катоў і сабак — у каталогах на *www.forum.superkot.com*

ЦІКАВА

# «PARTISAN» ПРА КУЛЬТУРУ ЛЮБЛІНА

Мікіта БРОЎКА

**Выйшаў 16-ы нумар альманаха сучаснай беларускай культуры «pARTisan», што прысвечаны мастацкаму асяродку Люблiна.**

Нумар «Культура Любліна» — адзін з трох двухмоўных нумароў, якія будуць выдадзены сумесна з польскім грамадска-культурніцкім інтэрнэт-часопісам «Kultura Enter». Наступныя сумесныя нумары плануецца прысвяціць культуры Мінску і найноўшым тэндэнцыям у сучасным мастацтве Беларусі і Польшчы.

Да стварэння такога нумару рэдактараў выдання Артура Клінава і Паўла Лаўфера падштурхнула ідэя спазнаць і сутыкнуць польскіх і беларускіх творцаў, сучаснае мастацтва Беларусі і Польшчы, асяродкі Мінску і Любліну. Але было вырашана не рабіць суцэльнага параўнання і засяродзіцца на знаёмстве з людзьмі і дэманстрацыі іх дасягненняў.




Культура Любліна ў нумары паказана досыць шматбакова: акрамя артыкулаў пра люблінскіх творцаў, арт-групы і галерэі прадстаўлены інтэрв'ю з выбітнымі дзеячамі люблінскага мастацтва, працы люблінскіх мастакоў. У канцы нумара знайшлося месца для сціслага аповеду пра люблінскіх мастакоў, мапы люблінскіх галерэй сучаснага мастацтва і агляду некаторых рэгулярных культурніцкіх падзей Любліну.

Першапачаткова праект «pARTisan» быў спробай прэзентацыі сучаснай беларускай культуры за мяжой, а пасля трансфармаваўся ў альманах сучаснай беларускай культуры.

Выданне існуе з 2002 года. Альманах выдаваўся нерэгулярна — былі часы, калі за год выходзіў толькі адзін нумар. Зараз рэдакцыя плануе выдаваць шэсць нумароў на год. А сёлета плануецца паставіць рэкорд, і выпусціць 7 нумароў.




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1127

Падпісана да друку 04.11.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.